БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ

ЖУРНАЛ
БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА

# ИСТОРИЯ

ЧАСОПІС
БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

# ГІСТОРЫЯ

JOURNAL
OF THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY

# HISTORY

Издается с января 1969 г.
(до 2017 г. – под названием «Веснік БДУ.
Серыя 3, Гісторыя. Эканоміка. Права»)

Выходит один раз в квартал

3

2021

МИНСК
БГУ

## РЕДАКЦИОННАЯ КОЛЛЕГИЯ

**Главный редактор** — **КОХАНОВСКИЙ А. Г.** – доктор исторических наук, профессор; декан исторического факультета Белорусского государственного университета, Минск, Беларусь.
E-mail: kohanovsky@bsu.by

**Заместитель главного редактора** — **МЕНЬКОВСКИЙ В. И.** – доктор исторических наук, профессор; профессор кафедры истории России исторического факультета Белорусского государственного университета, Минск, Беларусь.
E-mail: menkovski@bsu.by

**Ответственный секретарь** — **МАЛЮГИН О. И.** – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры истории древнего мира и средних веков исторического факультета Белорусского государственного университета, Минск, Беларусь.
E-mail: maliugin@bsu.by

***Белецкий С. В.*** Институт истории материальной культуры Российской академии наук, Санкт-Петербург, Россия.
***Бон Т.*** Гисенский университет им. Юстуса Либиха, Гисен, Германия.
***Бородкин Л. И.*** Московский государственный университет им. М. В. Ломоносова, Москва, Россия.
***Воланcки Ф.*** Институт истории Вроцлавского университета, Вроцлав, Польша.
***Жеребцов И. Л.*** Институт языка, литературы и истории Коми научного центра Уральского отделения Российской академии наук, Сыктывкар, Республика Коми.
***Линднер Р.*** Констанцкий университет, Констанц, Германия.
***Упадуэй А.*** Центр российских и центральноазиатских исследований Университета им. Джавахарлала Неру, Дели, Индия.
***Фишер Д.*** Техасский университет в Браунсвилле, Браунсвилл, США.
***Фэн Ш.*** Институт международных отношений и регионального развития, Центр изучения России Восточно-Китайского педагогического университета, Шанхай, Китай.
***Шмигель М.*** Университет Матея Бела, Банска-Бистрица, Словакия.
***Яновский О. А.*** Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь.

## МЕЖДУНАРОДНЫЙ РЕДАКЦИОННЫЙ СОВЕТ

***Бригадин П. И.*** Институт бизнеса Белорусского государственного университета, Минск, Беларусь.
***Вабищевич А. Н.*** Брестский государственный университет им. А. С. Пушкина, Брест, Беларусь.
***Виддер Э.*** Институт средневековой истории Тюбингенского университета им. Эберхарда Карла, Тюбинген, Германия.
***Дук Д. В.*** Могилёвский государственный университет им. А. А. Кулешова, Могилёв, Беларусь.
***Карпов С. П.*** Московский государственный университет им. М. В. Ломоносова, Москва, Россия.
***Карпюк С. Г.*** Институт всеобщей истории Российской академии наук, Москва, Россия.
***Коваленя А. А.*** Национальная академия наук Беларуси, Минск, Беларусь.
***Колесник В. Ф.*** Киевский национальный университет им. Тараса Шевченко, Киев, Украина.
***Космач В. А.*** Витебский государственный университет им. П. М. Машерова, Витебск, Беларусь.
***Кошелев В. С.*** Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь.
***Лавринович Д. С.*** Могилёвский государственный университет им. А. А. Кулешова, Могилёв, Беларусь.
***Ларин М. В.*** Историко-архивный институт Российского государственного гуманитарного университета, Москва, Россия.
***Локотко А. И.*** Национальная академия наук Беларуси, Минск, Беларусь.
***Марзалюк И. А.*** Палата представителей Национального собрания Республики Беларусь, Минск, Беларусь.
***Мезга Н. Н.*** Гомельский государственный университет им. Франциска Скорины, Гомель, Беларусь.
***Микнис Р.*** Институт истории Литвы, Вильнюс, Литва.
***Нечухрин А. Н.*** Гродненский государственный университет им. Янки Купалы, Гродно, Беларусь.
***Пилипенко М. Ф.*** Институт искусствоведения, этнографии и фольклора им. Кондрата Крапивы Центра исследований белорусской культуры, языка и литературы Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь.
***Туманс Х.*** Латвийский университет, Рига, Латвия.
***Ходин С. Н.*** Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь.
***Федосик В. А.*** Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь.
***Шадурский В. Г.*** Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь.

## РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

| | |
|---|---|
| **Галоўны рэдактар** | **КАХАНОЎСКІ А. Г.** – доктар гістарычных навук, прафесар; дэкан гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Мінск, Беларусь. E-mail: kohanovsky@bsu.by |
| **Намеснік галоўнага рэдактара** | **МЕНЬКОЎСКІ В. І.** – доктар гістарычных навук, прафесар; прафесар кафедры гісторыі Расіі гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Мінск, Беларусь. E-mail: menkovski@bsu.by |
| **Адказны сакратар** | **МАЛЮГІН А. І.** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; дацэнт кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Мінск, Беларусь. E-mail: maliugin@bsu.by |

*Бародкін Л. І.* Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. В. Ламаносава, Масква, Расія.
*Бон Т.* Гісенскі ўніверсітэт імя Юстуса Лібіха, Гісен, Германія.
*Бялецкі С. В.* Інстытут гісторыі матэрыяльнай культуры Расійскай акадэміі навук, Санкт-Пецярбург, Расія.
*Валанскі Ф.* Інстытут гісторыі Вроцлаўскага ўніверсітэта, Вроцлаў, Польшча.
*Жарабцоў І. Л.* Інстытут мовы, літаратуры і гісторыі Комі навуковага цэнтра Уральскага аддзялення Расійскай акадэміі навук, Сыктыўкар, Рэспубліка Комі.
*Лінднер Р.* Канстанцкі ўніверсітэт, Канстанц, Германія.
*Упадуэй А.* Цэнтр расійскіх і цэнтральнаазіяцкіх даследаванняў Універсітэта імя Джавахарлала Неру, Дэлі, Індыя.
*Фішэр Д.* Тэхаскі ўніверсітэт у Браўнсвіле, Браўнсвіл, ЗША.
*Фэн Ш.* Інстытут міжнародных адносін і рэгіянальнага развіцця, Цэнтр вывучэння Расіі Усходне-Кітайскага педагагічнага ўніверсітэта, Шанхай, Кітай.
*Шмігель М.* Універсітэт Мацея Бела, Банска-Бістрыца, Славакія.
*Яноўскі А. А.* Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.

## МІЖНАРОДНЫ РЭДАКЦЫЙНЫ САВЕТ

*Брыгадзін П. І.* Інстытут бізнесу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Мінск, Беларусь.
*Вабішчэвіч А. М.* Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна, Брэст, Беларусь.
*Відэр Э.* Інстытут сярэднявечнай гісторыі Цюбінгенскага ўніверсітэта імя Эберхарда Карла, Цюбінген, Германія.
*Дук Д. У.* Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова, Магілёў, Беларусь.
*Каваленя А. А.* Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Мінск, Беларусь.
*Калеснік В. Ф.* Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт імя Тараса Шаўчэнкі, Кіеў, Украіна.
*Карпаў С. П.* Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. В. Ламаносава, Масква, Расія.
*Карпюк С. Г.* Інстытут усеагульнай гісторыі Расійскай акадэміі навук, Масква, Расія.
*Космач В. А.* Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава, Віцебск, Беларусь.
*Кошалеў У. С.* Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.
*Лакотка А. І.* Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Мінск, Беларусь.
*Ларын М. В.* Гісторыка-архіўны інстытут Расійскага дзяржаўнага гуманітарнага ўніверсітэта, Масква, Расія.
*Лаўрыновіч Д. С.* Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова, Магілёў, Беларусь.
*Марзалюк І. А.* Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Мінск, Беларусь.
*Мікніс Р.* Інстытут гісторыі Літвы, Вільнюс, Літва.
*Мязга М. М.* Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны, Гомель, Беларусь.
*Нячухрын А. М.* Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Гродна, Беларусь.
*Піліпенка М. Ф.* Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь.
*Туманс Х.* Латвійскі ўніверсітэт, Рыга, Латвія.
*Ходзін С. М.* Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.
*Фядосік В. А.* Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.
*Шадурскі В. Г.* Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.

## EDITORIAL BOARD

**Editor-in-chief** **KAKHANOUSKI A. G.**, doctor of science (history), full professor; dean of the faculty of history, Belarusian State University, Minsk, Belarus.
E-mail: kohanovsky@bsu.by

**Deputy editor-in-chief** **MENKOUSKI V. I.**, doctor of science (history), full professor; professor at the department of Russian history, faculty of history, Belarusian State University, Minsk, Belarus.
E-mail: menkovski@bsu.by

**Executive secretary** **MALIUGIN O. I.**, PhD (history), docent; associate professor at the department of ancient and medieval history, faculty of history, Belarusian State University, Minsk, Belarus.
E-mail: maliugin@bsu.by

***Beletsky S. V.*** Institute of History of Material Culture of the Russian Academy of Sciences, Saint Petersburg, Russia.
***Bohn T.*** Justus Liebig University of Giessen, Giessen, Germany.
***Borodkin L. I.*** Lomonosov Moscow State University, Moscow, Russia.
***Feng Sh.*** School of Advanced International and Area Studies, Centre for Russian Studies of the East China Normal University, Shanghai, China.
***Fisher D. C.*** University of Texas Rio Grande Valley, Brownsville, USA.
***Lindner R.*** University of Konstanz, Konstanz, Germany.
***Šmigeľ M.*** Matej Bel University, Banská Bystrica, Slovakia.
***Upadhyay A.*** Centre for Russian and Central Asian Studies, Jawaharlal Nehru University, New Delhi, India.
***Wolański F.*** Institute of History, University of Wroclaw, Wroclaw, Poland.
***Yanouski A.*** Belarusian State University, Minsk, Belarus.
***Zherebtsov I. L.*** Institute of Language, Literature and History, Komi Science Centre, Ural Branch of the Russian Academy of Sciences, Syktyvkar, Komi Republic.

## INTERNATIONAL EDITORIAL COUNCIL

***Bryhadzin P. I.*** Institute of Business, Belarusian State University, Minsk, Belarus.
***Duk D. V.*** Mogilev State A. Kuleshov University, Mogilev, Belarus.
***Fedosik V. A.*** Belarusian State University, Minsk, Belarus.
***Karpov S. P.*** Lomonosov Moscow State University, Moscow, Russia.
***Karpyuk S. G.*** Institute of World History, Russian Academy of Sciences, Moscow, Russia.
***Khodzin S. N.*** Belarusian State University, Minsk, Belarus.
***Kolesnyk V. F.*** Taras Shevchenko National University of Kyiv, Kyiv, Ukraine.
***Koshelev V. S.*** Belarusian State University, Minsk, Belarus.
***Kosmach V. A.*** Vitebsk State University named after P. M. Masherov, Vitebsk, Belarus.
***Kovalenya A. A.*** National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus.
***Larin M. V.*** Institute for History and Archives, Russian State University for Humanities, Moscow, Russia.
***Lavrinovich D. S.*** Mogilev State A. Kuleshov University, Mogilev, Belarus.
***Lokotko A. I.*** National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus.
***Marzaluk I. A.*** House of Representatives of the National Assembly of the Republic of Belarus, Minsk, Belarus.
***Miazga M. M.*** Francisk Skorina Gomel State University, Gomel, Belarus.
***Miknys R.*** Institute of Lithuanian History, Vilnius, Lithuania.
***Nechukhrin A. N.*** Yanka Kupala State University of Grodno, Grodno, Belarus.
***Pilipenko M. F.*** Kandrat Krapiva Institute of Arts Studies, Ethnography and Folklore of the Center for the Belarusian Culture, Language and Literature Research of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus.
***Shadurski V. G.*** Belarusian State University, Minsk, Belarus.
***Tumans H.*** University of Latvia, Riga, Latvia.
***Vabishchevich A. N.*** Brest State University named after A. S. Pushkin, Brest, Belarus.
***Widder E.*** Medieval History Institute, Eberhard Karls University of Tübingen, Tübingen, Germany.

## ОТ РЕДАКЦИИ
## АД РЭДАКЦЫІ
## EDITORIAL

В 2021 г. отмечает 100-летний юбилей Белорусский государственный университет – старейший классический университет на территории Беларуси. Начало его истории восходит к 25 февраля 1919 г., когда был принят декрет Центрального исполнительного комитета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов Белоруссии об открытии университета в Минске. Однако обстоятельства, прежде всего советско-польская война, сложились так, что начать свою деятельность БГУ смог лишь два года спустя: летом 1921 г. был открыт рабочий факультет, а 31 октября – медицинский и общественных наук. Официальное же открытие БГУ состоялось 30 октября на торжественном собрании партийно-советского руководства, общественности, профессуры и студентов.

Для работы в новом университете в Минск приехали многие известные ученые и преподаватели не только из советских республик, но и из-за границы. Были заложены основы формирования научных школ, возникли первые научные коллективы. Начало деятельности БГУ – это начало становления белорусской системы высшего образования и науки.

На базе Белорусского государственного университета возникло множество учебных и научных учреждений. Это Государственная (в последующем – Национальная) библиотека Беларуси, выделившаяся в 1926 г. из университетской библиотеки, ряд институтов, несколько медицинских клиник, НИИ и др. Кадровую основу созданной в 1928 г. Белорусской академии наук также составили ученые университета: в числе первых академиков – половина представителей БГУ.

Тяжелые испытания выпали на долю сотрудников и студентов университета в военные годы. Тем не менее уже в 1943 г. работа БГУ была восстановлена на ст. Сходня под Москвой, а осенью 1944 г. занятия возобновились в освобожденном Минске.

В послевоенные годы в БГУ были созданы и успешно работают по сей день десятки научных школ в области естественных и гуманитарных наук, которые с полным правом считаются национальным достоянием. Университет готовит высококлассных специалистов чуть ли не для всех отраслей народного хозяйства страны, образовательной, научной и иных сфер. Можно с уверенностью констатировать: вековая история БГУ – это и история самостоятельной Беларуси.

В тематическом разделе номера представлены материалы, которые освещают различные аспекты 100-летней истории университета, посвященные преимущественно первым – наименее изученным – годам его становления и развития.

В статье А. Г. Кохановского и О. А. Яновского рассмотрены первые десятилетия формирования исторической науки в БГУ. Сделан вывод о том, что с самого начала деятельности в нем развивались важнейшие направления исторических исследований. Особое место заняло белорусоведение – важнейшая сфера профессиональной деятельности как историков, так и археологов, этнографов, источниковедов, историографов, архивистов. Также глубоко изучалась российская и общеславянская история, с 1920-х гг. берут начало белорусские антиковедение, медиавистика, новистика и др. Отмечается, что столь широкий спектр исследований во многом определялся тем, что университет должен был готовить специалистов в соответствующих областях знаний. Историки БГУ инициировали создание отдельных исследовательских обществ и учреждений, в том числе Института белорусской культуры и Белорусской академии наук. Выделяются этапы развития университетской исторической науки.

В исследовании О. А. Яновского на основе архивных материалов и других источников рассмотрен сложный процесс становления математического

образования, а также научные исследования в различных областях математической науки в Белорусском государственном университете. Особое внимание обращено на дискуссии 1919–1921 гг. среди официальных лиц и ученых по поводу необходимости создания в БГУ отдельного математического факультета. Впервые подробно излагается позиция выдающегося математика и организатора математического образования уроженца Беларуси И. Р. Брайцева. О. А. Яновский отмечает, что 1920-е гг. – значимый этап в формировании высокого уровня университетской математики.

Статья О. И. Малюгина посвящена рассмотрению научной и педагогической деятельности знаменитого слависта А. Н. Ясинского в последний – московско-минский – период его жизни. Революционные события 1917–1921 гг. вынудили его, как и многих других представителей столичной интеллигенции, искать работу в новых провинциальных университетах. С 1922 г. он преподавал в БГУ, став одним из родоначальников белорусской медиевистики и славистики. В 1928 г. был избран академиком вновь созданной Белорусской академии наук, где продолжал исследования как чешского Средневековья, так и истории Беларуси в Средние века. Внешние обстоятельства не позволили А. Н. Ясинскому создать в Беларуси свою научную школу, а его исследования 1920-х гг. остались малоизвестными.

В материале В. А. Остроги анализируются место и роль кафедры истории нового и новейшего времени исторического факультета БГУ в становлении и развитии преподавания в различных высших учебных заведениях Беларуси в 1930–1970-е гг. Рассмотрена эволюция кафедры как ведущего научно-образовательного центра в своей области. Характеризуется работа преподавателей БГУ в Минском государственном педагогическом институте имени А. М. Горького, Витебском государственном педагогическом институте имени С. М. Кирова, Минской высшей партийной школе при ЦК КПБ, Минском государственном педагогическом институте иностранных языков, Гомельском государственном университете имени Франциска Скорины и др.

Редакция надеется, что представленные материалы найдут отклик среди читателей и вызовут интерес не только к истории Белорусского государственного университета, но и к истории высшего образования и науки в Беларуси в целом.

# Тематический раздел

# Тэматычны раздзел

# Special topic section

## К столетию создания БГУ

## Да стагоддзя стварэння БДУ

## Belarusian State University celebrates 100th anniversary

УДК 93/94:378.4(476-25)096+93/94(072)

# СТАНОВЛЕНИЕ И РАЗВИТИЕ ИСТОРИЧЕСКОЙ НАУКИ В БЕЛОРУССКОМ ГОСУДАРСТВЕННОМ УНИВЕРСИТЕТЕ (1920–50-е гг.)

***А. Г. КОХАНОВСКИЙ***[1)], ***О. А. ЯНОВСКИЙ***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Рассмотрен вековой путь становления и развития исторической науки в Белорусском государственном университете. Сделан вывод о том, что с самого основания в нем сформировались важнейшие направления исторических исследований. Особое место заняло белорусоведение, которое стало сферой профессиональной деятельности

**Образец цитирования:**
Каханоўскі АГ, Яноўскі АА. Станаўленне і развіццё гістарычнай навукі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце (1920–50-я гг.). *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2021;3:7–18.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2021-3-7-18

**For citation:**
Kakhanouski AG, Yanouski AA. Formation and development of historical science in the Belarusian State University (1920–50s). *Journal of the Belarusian State University. History.* 2021;3:7–18. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2021-3-7-18

**Авторы:**
***Александр Геннадьевич Кохановский*** – доктор исторических наук, профессор; декан исторического факультета.
***Олег Антонович Яновский*** – кандидат исторических наук, профессор; заведующий кафедрой истории России исторического факультета.

**Authors:**
***Aliaksandr G. Kakhanouski***, doctor of science (history), full professor; dean of the faculty of history.
*kohanovsky@bsu.by*
***Aleh A. Yanouski***, PhD (history), full professor; head of the department of Russian history, faculty of history.
*helgoleg@mail.ru*

CC BY NC

как историков, так и археологов, этнографов, источниковедов, историографов, архивистов. Также глубоко изучалась российская и общеславянская история, с 1920-х гг. берут начало белорусские антиковедение, медиавистика, новистика и др. Отмечается, что столь широкий спектр исследований во многом определялся тем, что университет должен был готовить специалистов в соответствующих областях знаний. Историки БГУ инициировали создание отдельных исследовательских обществ и учреждений, в том числе Института белорусской культуры и Белорусской академии наук. Описаны этапы развития, а также современное состояние университетской исторической науки.

***Ключевые слова:*** историческая наука; историки; Белорусский государственный университет; белорусоведение; учебники по истории; научные школы; подготовка научных кадров.

## СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУКІ Ў БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ (1920–50-я гг.)

***А. Г. КАХАНОЎСКІ***[1*]***, А. А. ЯНОЎСКІ***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Разгледжаны 100-гадовы шлях станаўлення і развіцця гістарычнай навукі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Зроблена выснова аб тым, што з самага заснавання ў ім сфарміраваліся важнейшыя вобласці гістарычных даследаванняў. Асаблівае месца заняло беларусазнаўства, якое стала сферай прафесійнай дзейнасці як гісторыкаў, так і археолагаў, этнографаў, крыніцазнаўцаў, гістарыёграфаў, архівістаў. Адначасова глыбока вывучалася расійская і агульнаславянская гісторыя, з 1920-х гг. бяруць свой пачатак беларускія антыказнаўства, медыявістыка, навістыка і інш. Заўважана, што такі шырокі спектр навуковых даследаванняў шмат у чым вызначаны тым, што ўніверсітэт павінен быў рыхтаваць спецыялістаў адпаведных кірункаў ведаў. Гісторыкі БДУ з'яўляліся ініцыятарамі стварэння асобных навукова-даследчых таварыстваў і ўстаноў, у тым ліку Інстытута беларускай культуры і Беларускай акадэміі навук. Апісаны этапы развіцця, а таксама сучасны стан гістарычнай навукі ў БДУ.

***Ключавыя словы:*** гістарычная навука; гісторыкі; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; беларусазнаўства; падручнікі па гісторыі; навуковыя школы; падрыхтоўка навуковых кадраў.

## FORMATION AND DEVELOPMENT OF HISTORICAL SCIENCE IN THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY (1920–50s)

***A. G. KAKHANOUSKI***[a]***, A. A. YANOUSKI***[a]

[a]*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus*

*Corresponding author: A. G. Kakhanouski (kohanovsky@bsu.by)*

The article examines the century long way of formation and development of historical science at the Belarusian State University. It is concluded that from the very beginning of the university's activity, the most important directions of historical research were formed in it. A special place was occupied by Belarusian studies, which became the sphere of professional activity of both historians and archaeologists, ethnographers, source researchers, historiographers, and archivists. At the same time, Russian and Slavic history was also deeply studied and since the 1920s. Belarusian antiquity, media studies, novistics et cetera has originated. It is noted that such a wide range of studies was largely determined by the fact that the university had to train specialists in the relevant fields of knowledge. Historians of BSU initiated the creation of separate research societies and institutions, including the Institute of Belarusian Culture and the Belarusian Academy of Sciences. Highlighted the stages of development of university historical science, which were characterised by their distinctive features and were determined by socio-political factors. The current state of the historical science of BSU is outlined.

***Keywords:*** historical science; historians; Belarusian State University; Belarusian studies; history textbooks; scientific schools; training of scientific personnel.

## Уводзіны

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт святкуе 100-годдзе. Дата, без перабольшання, мае выключнае значэнне не толькі для самой установы адукацыі, але і для краіны. З пачатку працы ўніверсітэт стаў важнейшым інстытутам, які вызначыў станаўленне вышэйшай адукацыі і навукі ў нашай краіне і садзейнічаў афармленню сучаснай беларускай дзяржаўнасці. БДУ адыграў таксама выключную ролю ў інстытуцыяналізацыі гістарычнай навукі ў Беларусі, хаця асобныя даследаванні ў гэтай галіне бяруць пачатак у XIX ст., калі пад уплывам ідэй рамантызму нараджалася цікавасць да беларусазнаўства.

На парозе 100-гадовага юбілею неабходна звярнуцца да развіцця гістарычнай навукі ў БДУ, якая сёння прадстаўлена перш за ўсё даследаваннямі, здзейсненымі на гістарычным факультэце. У апошнюю чвэрць стагоддзя вывучэнне гісторыі знешняй палітыкі пашырана таксама і на факультэце міжнародных адносін.

Гістарычны факультэт назапасіў, без сумнення, найбольшы ў краіне навуковы і экспертны патэнцыял практычна па ўсяму спектру гістарычных ведаў. Тут працуюць вядомыя ў Беларусі і за яе межамі гісторыкі, медыявісты, антыказнаўцы, мастацтвазнаўцы, этнолагі, археолагі, архівісты, спецыялісты ў галіне дакументацыйнага забеспячэння кіравання і інш. У іх ліку – 18 дактароў навук, прафесараў, каля 80 кандыдатаў навук, дацэнтаў. На факультэце атрымалі развіццё навуковыя школы па гісторыі беларускай дзяржаўнасці, сацыяльнай гісторыі Беларусі, германістыцы, гісторыі Расіі і славянскіх краін, краін Бліжняга Ўсходу і Паўночнай Афрыкі, гістарыяграфіі, крыніцазнаўству і інш. На гістарычным факультэце дзейнічае буйнейшая ў Беларусі аспірантура і дактарантура па гістарычных навуках. На дзевяці кафедрах дынамічна развіваюцца навуковыя даследаванні, актуалізуюцца іх прыярытэты і тэматыка, абнаўляецца метадалагічны інструментарый. Вельмі актыўна выкарыстоўваецца міждысцыплінарны падыход. Навуковую працу выкладчыкаў і супрацоўнікаў факультэта вызначае высокая публікацыйная актыўнасць. За 2015–2021 гг. імі апублікавана каля 3700 навуковых работ, у тым ліку звыш 60 манаграфічных даследаванняў, каля 280 навучальных дапаможнікаў (агульным аб'ёмам звыш 4500 друк. арк.). У апошнія гады на аснове шматлікіх архіўных матэрыялаў выкладчыкамі і супрацоўнікамі гістарычнага факультэта падрыхтаваны тры кнігі выдання «Интеллектуальная элита Беларуси» [1–3], дзе праз жыццёвы і творчы шлях прафесараў універсітэта паказана значэнне навукі і ўніверсітэцкай карпарацыі ў станаўленні нацыянальнай беларускай дзяржавы, яе палітычных і культурных асноў. Да друку падрыхтаваныя яшчэ дзве кнігі з гэтай серыі.

Штогод факультэт арганізуе і праводзіць у сярэднім 20–30 навуковых мерапрыемстваў рознага ўзроўню: міжнародныя навуковыя канферэнцыі, круглыя сталы, семінары і інш. Выкладчыкі факультэта выступаюць з дакладамі на канферэнцыях у іншых навукова-педагагічных установах Беларусі і за яе межамі. Асабліва варта адзначыць істотнае значэнне ўдзелу выкладчыкаў і навучэнцаў факультэта ў выкананні заданняў дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў на працягу апошніх 15–20 гадоў. У 2016–2020 гг. факультэт з'яўляўся адной з галаўных арганізацый выканання падпраграмы «Гісторыя і культура» ў межах Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства». Плённае супрацоўніцтва з Інстытутам гісторыі НАН Беларусі і даследчыкамі з іншых вышэйшых навучальных устаноў (ВНУ) краіны працягваецца ў межах выканання падпраграмы «Гісторыя», якая запланавана на 2021–2025 гг. як складовая частка Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы», дзе зноў жа Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт выступае ў якасці адной з галаўных арганізацый.

## Метадалогія і гістарыяграфія даследавання

Вызначаную ў загалоўку артыкула тэму аўтары ў сваіх ранейшых публікацыях разглядалі неаднойчы, але закраналі толькі некаторыя яе аспекты: аналізавалі пэўны храналагічны перыяд, высвятлялі характар навуковых даследаванняў гісторыкаў БДУ, апісвалі творчы лёс таго ці іншага гісторыка, каб на яго прыкладзе прасачыць некаторыя агульныя тэндэнцыі станаўлення і далейшага развіцця як універсітэцкай, так і беларускай гістарычнай навукі [4; 5]. У дадзеным выпадку, з нагоды 100-гадовага юбілею нашай альма-матар, ёсць усе падставы больш абагулена і паслядоўна разглядзець, як з 1921 г. і да канца 1950-х гг. супольніцтва гісторыкаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта вызначала найважнейшыя кірункі даследаванняў, ажыццяўляла індывідуальныя і калектыўныя навуковыя распрацоўкі праблем, імкнучыся адпавядаць самым высокім патрабаванням прафесіі і запытам дзяржавы і грамадства.

Раскрыццё заяўленай тэмы патрабуе вырашэння некалькіх задач: па-першае, вызначыць этапы

станаўлення і развіцця гістарычнай навукі ў БДУ; па-другое, акрэсліць найбольш характэрныя для ўніверсітэцкіх вучоных вобласці навуковых інтарэсаў з улікам пастаянных змен у творчых прыярытэтах; па-трэцяе, прадставіць дзясяткі выдатных асоб з універсітэцкай карпарацыі гісторыкаў. Зразумела, відавочнай рысай развіцця гістарычнай навукі ў БДУ на працягу ўсяго 100-гадовага шляху было шчыльнае супрацоўніцтва як з беларускімі калегамі (акадэмічнымі даследчыкамі і гісторыкамі большасці ВНУ), так і з гісторыкамі спачатку ўсёй савецкай дзяржавы, а сёння – многіх краін свету. Характэрна, што ўжо з першых гадоў дзейнасці БДУ яго гісторыкі падтрымлівалі вельмі цесныя адносіны з калегамі – прадстаўнікамі шматлікіх еўрапейскіх універсітэтаў.

Сама пастаноўка тэмы і шырыня яе храналагічных рамак патрабуюць асэнсавання найбольш відавочных этапаў эвалюцыі ўніверсітэцкай гістарычнай навукі. Пры гэтым трэба ўлічваць пэўную ўмоўнасць іх вылучэння, бо кожны мае свае ўнутраныя падзелы і навуковыя дамінанты. Нельга ігнараваць розныя падзеі і працэсы, якія магчыма браць за кропкі адліку для характарыстыкі развіцця гісторыі як навукі, гісторыі як прадмета вывучэння і выкладання, а таксама гісторыі як перасячэння мінулага і сучаснага. Гэтыя аспекты ў розных даследчыцкіх інтэрпрэтацыях і з рознай пастаноўкай праблемы неаднойчы браліся да ўвагі беларускімі гісторыкамі [6–8]. Няпоўны пералік навуковых даследаванняў гісторыкаў БДУ за 1921–1994 гг. знайшоў адлюстраванне ў [9].

## Асноўная частка

Кожнаму этапу развіцця ўніверсітэцкай гістарычнай навукі ў той ці іншай ступені адпавядае дзейнасць канкрэтных навукоўцаў. Творчасць некаторых ахоплівае некалькі этапаў. Трэба адразу звярнуць увагу на ўнікальны па сваёй сутнасці факт: з самых вытокаў дзейнасці БДУ ў яго сценах пачаліся даследаванні амаль што па ўсіх найважнейшых напрамках гістарычнай навукі. Трэба ўлічваць, што ў Беларусі да гэтага не было сістэмнай распрацоўкі ўласна айчыннай гісторыі, не гаворачы ўжо пра праблематыку ўсеагульнай, а тым больш некаторыя асаблівыя і спецыфічныя кірункі гістарычных ведаў.

У 1920-я гг. не вучэбныя праграмы патрабавалі прыцягнення адпаведных спецыялістаў, а навуковая кваліфікацыя і схільнасці даследчыкаў вызначалі структуру вучэбнага працэсу. Выкладанне розных гістарычных дысцыплін было вельмі стракатым, у суме яны ахоплівалі як важнейшыя раздзелы, так і пэўныя тэмы гісторыі, што адлюстроўвалі тагачасныя навуковыя прыхільнасці выкладчыкаў. Гэту сітуацыю цікава падаў у сваіх успамінах адзін з першых прафесараў-гісторыкаў БДУ У. М. Перцаў. Ён адзначаў, што ўніверсітэт пэўны час знаходзіўся ў «зародышевой своей жизни, и ему приходилось прокладывать себе дорогу в будущее среди великого рода препятствий»[1]. Прафесар меў на ўвазе тое, што «не было твердого учебного плана, ни программ отдельных дисциплин… приходилось ориентироваться на наличные преподавательские силы, а не на учебные планы; иначе говоря, не столько преподаватели приглашались для чтения определенных курсов, сколько определение и характер курса находились в зависимости от имеющихся научных сил». Гісторык таксама падкрэсліваў факт адсутнасці ў першыя гады ўніверсітэцкіх кафедр «как организации преподавателей определенного цикла родственных дисциплин». Іх замянялі гістарычныя прадметныя камісіі, спачатку на факультэце грамадскіх навук, а з 1922 г. – на педагагічным факультэце[2].

Прадметныя камісіі ў складзе, як правіла, прафесараў паступова фарміравалі вучэбны план. У ім улічваліся і запатрабаванні сферы школьнай адукацыі, і неабходнасць рыхтаваць дасканалых і рознабаковых навукоўцаў. Адзначым і такі важны аспект станаўлення гістарычнай навукі ў БДУ, як увага да гісторыі народнай адукацыі ў цэлым, а таксама да гісторыі вышэйшай школы ў Беларусі, Літве, Расіі, Польшчы. Акрамя таго, трэндам першага дзесяцігоддзя развіцця БДУ была зацікаўленасць студэнцтва гісторыяй навукі і тэхнікі, розных дакладных прыродазнаўчых і гуманітарных навук. Без перабольшання можна казаць, што з’явілася грунтоўная навуковая аснова для развіцця важнейшых кірункаў гісторыі, што абумовіла насычэнне вучэбнага працэсу ў БДУ разнастайнымі і глыбокімі па сваёй сутнасці курсамі, спецкурсамі, семінарамі. Тым самым ствараліся ўмовы для хуткай падрыхтоўкі гісторыкаў вышэйшай прафесійнай кваліфікацыі ў Беларусі. Такім чынам, з 1921 г. у БДУ з нарастаючай інтэнсіўнасцю і выніковасцю сталі весціся даследаванні па некалькіх напрамках гістарычных ведаў. Адразу сфарміравалася ўніверсітэцкае беларусазнаўства, якое з першых дзён стала паўнавартасным па сваіх складніках: гісторыі, архівістыцы, крыніцазнаўству, археалогіі, этнаграфіі, мастацтвазнаўству, краязнаўству. Яго ўвасобілі прадстаўнікі першага складу выкладчыкаў факультэта грамадскіх навук і педагагічнага

[1]Нац. арх. Рэсп. Беларусь (НАРБ). Ф. 205. Воп. 1. Спр. 751. Арк. 101–102.
[2]Там жа.

факультэта, а ў хуткім часе і іх першыя выпускнікі. Пачынальнікамі сталі першы рэктар БДУ У. І. Пічэта, наркам, дэкан і прафесар У. М. Ігнатоўскі, а разам з імі М. В. Доўнар-Запольскі, Д. І. Даўгяла, В. Д. Дружчыц, А. М. Ляўданскі, М. М. Шчыкаціхін, І. А. Сербаў, А. А. Савіч, І. І. Краскоўскі, Д. А. Дудкоў, І. А. Віткоўскі і інш. У хуткім часе да іх далучыліся першыя аспіранты, падрыхтаваныя на педагагічным факультэце. Спачатку некалькі здольных маладых людзей (Ф. І. Забела, А. В. Бурдзейка, К. М. Таўсталес-Шыёнак і інш.) сканцэнтруюцца вакол У. І. Пічэты і стануць спасцігаць навуковую беларусістыку па ўнікальных хатніх «пічэтніках», а з 1927 г. аспірантура БДУ афіцыйна пачне рыхтаваць навуковыя кадры. Першымі, каго Наркампрас БССР накіруе на вучобу ў аспірантуры, стануць гісторыкі К. І. Кернажыцкі і В. І. Скардзіс.

Неабходна падкрэсліць адметную ролю БДУ ў арганізацыі ў БССР навуковых даследаванняў па гісторыі, стварэнні Інбелкульта, а затым Беларускай акадэміі навук (БАН). Яшчэ вясной 1921 г. было вырашана стварыць у складзе ўніверсітэта асобны навукова-даследчы інстытут беларускай і яўрэйскай культуры. Праўда, з-за розных меркаванняў палічылі за лепшае арганізаваць толькі Інбелкульт, але па-за структурай БДУ. Між тым У. І. Пічэта быў адным з самых актыўных яго стваральнікаў.

Інстытуцыяналізацыя навуковых даследаванняў па розных кірунках гісторыі адбылася 30 снежня 1920 г., калі будучы рэктар У. І. Пічэта і члены камісіі па арганізацыі БДУ ўдзельнічалі ў стварэнні Таварыства гісторыі і старажытнасцей. З пачатку дзейнасці ўніверсітэта пасяджэнні таварыства праходзілі амаль выключна ў Доме № 1 БДУ, гісторыкі былі самымі актыўнымі іх удзельнікамі[3]. Так, 25 лютага 1922 г. адбыўся арганізацыйны сход, на якім было прынята рашэнне аб стварэнні асобнага Навуковага таварыства БДУ з чатырма секцыямі (у тым ліку грамадскіх навук)[4]. Крыху пазней, 26 мая 1922 г., на савеце БДУ У. І. Пічэта дакладваў аб тым, што ўніверсітэт актыўна ўключыўся ў адраджэнне беларускай гісторыі і культуры і не страціў імкнення ў «ближайшем будущем» стварыць менавіта пры БДУ навукова-даследчы інстытут беларускай культуры, каб справа пайшла «быстрыми шагами»[5]. Як не раз адзначалася ў той час на розных узроўнях, універсітэт павінен быў «зьяўляцца цэнтрам разумовага росту для цэлага краю», «сапраўды культурным цэнтрам БССР»[6]. Усе гады дзейнасці большасць правадзейных членаў Інбелкульта складалі прафесары і выкладчыкі БДУ. У 1927 г. у спісе, які зацвярджаўся на пасяджэнні СНК БССР, усе 14 названых прозвішчаў правадзейных членаў належаць вучоным універсітэта[7]. Па сутнасці, ініцыятарам стварэння БАН быў рэктар У. І. Пічэта, аб чым сведчыць яго зварот да ўдзельнікаў VIII Усебеларускага з’езда Саветаў у красавіку 1927 г.: «Мне здаецца, што ў сучасны момэнт трэба паставіць пытаньне аб адчыненьні беларускай акадэміі навук. Калі на Беларусі будзе акадэмія навук, якая стане асяродкам навуковай працы, навуковы рух пойдзе ўперад больш хуткім тэмпам»[8]. Пазней, 14 кастрычніка 1928 г., газета «Звязда» надрукавала яго артыкул з аргументацыяй на карысць рэарганізацыі Інбелкульта ў акадэмію навук, бо гэта «…з’яўляецца фактам надзвычайна вялікага культурнага значэньня… Арганізацыя новай акадэміі дасьць магчымасьць яшчэ больш пашырыць навуковую працу ў справе ўсебаковага вывучэньня Беларусі…»[9].

У 1925–1926 гг. ва ўніверсітэце працаваў М. В. Доўнар-Запольскі, які падрыхтаваў у гэты перыяд дзве буйныя працы: «Народное хозяйство Белоруссии, 1861–1914 гг.» [10] і «История Белоруссии», якая доўгі час была недаступнай шырокаму колу чытачоў і была выдадзена толькі праз некалькі дзесяцігоддзяў [11]. Абедзве працы шмат у чым акрэслілі канцэптуальнае бачанне М. В. Доўнар-Запольскім гісторыі Беларусі, сталі прадметам дыскусій і крытычнага падыходу савецкіх гісторыкаў у пазнейшы час. Многія высновы навукоўца знайшлі пацвярджэнне ў працах сучасных беларускіх даследчыкаў. Асабліва гэта датычыцца яго думкі аб вылучэнні 1880-х гг. у якасці этапу капіталістычнай трансфармацыі беларускага грамадства. Канцэптуальнае асэнсаванне гісторыі Беларусі прысутнічала таксама ў працах У. М. Ігнатоўскага, У. І. Пічэты і інш. [12–16].

Заўважным кірункам даследаванняў гісторыкаў БДУ ў 1920-я гг. было расіязнаўства. Патрэбна звярнуць увагу на вялікую ролю Савецкай Расіі ў стварэнні ўніверсітэта ў Мінску. Тым больш што да 1923 г. менавіта яна фінансавала яго дзейнасць, з Расіі прыбылі ва ўніверсітэт многія прафесары. З пачатку 1921 г. запрашэнні працаваць у Мінску зыходзілі непасрэдна ад У. І. Пічэты, прызначанага кіраўніком часовага праўлення БДУ. Вопыт, шырокае кола кантактаў у навуковым асяроддзі дазвалялі яму паспяхова гэта рабіць. Праўда, не заўсёды ён праяўляў «рэвалюцыйную пільнасць», што,

[3]Минское общество истории и древностей // Вестн. Наркомпроса ССРБ. 1921. № 2. С. 40–42.
[4]НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 12. Арк. 4 зв.
[5]Там жа. Арк. 6.
[6]Сав. Беларусь. 1925. 4 лістап. (Тэксты дакументаў і матэрыялаў прыводзяцца з захаваннем моўных асаблівасцей арыгінала.)
[7]НАРБ. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 1276. Арк. 302–303.
[8]Звязда. 1927. 12 крас.
[9]Там жа. 1928. 14 кастр.

напрыклад, прывяло да заключэння дамоўленасці са знакамітым расіязнаўцам А. Ф. Ізюмавым, якога савецкія ўлады хутка абвінавацілі ў антысавецкіх настроях і на «філасофскім параходзе» выслалі за мяжу. Не склаўся лёс у Беларусі і спецыяліста па расійскай і польскай гісторыі В. У. Навадворскага[10]. Аднымі з прызнаных даследчыкаў-расіязнаўцаў былі Д. А. Жарынаў і А. А. Савіч. Запрашалі на працу ў БДУ С. А. Піянткоўскага – маладога даследчыка гісторыі рэвалюцыйных падзей і Грамадзянскай вайны. Да гэтай праблематыкі далучыліся першыя выхаванцы савецкай вышэйшай школы – «камвузаўцы» М. А. Поташ, М. С. Югаў, а таксама фактычна першы загадчык універсітэцкай кафедры гісторыі Расіі (потым – кафедры гісторыі народаў СССР Беларускага дзяржаўнага вышэйшага педагагічнага інстытута (далей – педінстытут)) У. Ю. Гесэн.

Станаўленне ў БДУ славяназнаўства як важнага навуковага кірунку таксама звязана з асобай У. І. Пічэты, хаця яго даследчыцкая актыўнасць у гэты час была скіравана пераважна на беларусазнаўства. Калі падлічыць колькасць прац, надрукаваных ім за беларускі перыяд жыцця і творчасці (з вясны 1921 г. да арышту ў верасні 1930 г.), карціна атрымліваецца відавочная: па беларусазнаўству ён выдаў больш за 90 прац, у той час як па расіязнаўству – крыху болей за 30, а па славяназнаўству – каля 20 [17, с. 35–51]. Адным з найбольш яркіх славістаў сярод выкладчыкаў БДУ быў А. М. Ясінскі. З верасня 1922 г. і па верасень 1928 г. ён працаваў у Мінску, быў зацверджаны ў шэрагу першых акадэмікаў БАН.

Названыя кірункі навуковых даследаванняў можна лічыць першаснымі ў аспекце важнасці для нараджэння беларускай гістарычнай навукі. Хаця не менш актуальным было засваенне іншых абласцей сусветнай гісторыі, у тым ліку і антыказнаўства ў яго шырокім даследчыцкім полі. Тут знамянальнай кропкай адліку стала першая лекцыя маскоўскага прафесара Д. П. Канчалоўскага, з якой і пачаўся навучальны працэс у БДУ. Так, 31 кастрычніка 1921 г. ён прачытаў студэнтам лекцыю аб культуры народаў Міжземнамор’я ў часы Рымскай імперыі. Пасля хуткага ад’езду ў Маскву першага лектара-прафесара БДУ яго курс выкладаў запрошаны са Смаленска У. М. Дзякаў – вядомы спецыяліст па гісторыі Старажытнага Рыма. Еўрапейскай медыявістыцы былі прысвечаны лекцыі С. А. Ляскоўскага, для яўрэйскай секцыі педагагічнага факультэта лекцыі па Антычнасці і Сярэднявеччы чытаў С. Р. Лазінскі. Падобнай тэматыкай займаліся прафесары І. Ю. Маркон, Г. С. Аляксандраў, І. Д. Сосіс. Спачатку ў выкладанні ўсеагульнай гісторыі дамінавала Антычнасць, бо ў БДУ было некалькі спецыялістаў у гэтай галіне. А вось медыявістыка атрымала пашырэнне ў сценах БДУ крыху пазней і ўвасобілася ў даследчыцкай працы У. М. Перцава і Д. М. Ягорава.

На высокі навуковы ўзровень адразу была ўзнятая гісторыя мастацтваў. Гэты кірунак гістарычных ведаў выкладалі М. М. Шчыкаціхін і М. Р. Сыркін. Па этнаграфіі і археалогіі глыбокія навуковыя даследаванні праводзілі І. А. Сербаў і А. М. Ляўданскі.

Змест выкладання ва ўніверсітэце ў 1920-я гг. быў цалкам прэрагатывай выкладчыка, асабліва калі ён быў знакаміты спецыяліст, прафесар. Для гэтага было некалькі прычын. Па-першае, напачатку нярэдка не хапала элементарнага парадку і дысцыпліны ў арганізацыі вучэбнага працэсу. Па-другое, прысутнічаў давер да выкладчыкаў, з такой цяжкасцю запрошаных на працу ў Мінск. Па-трэцяе, адчуваліся агульны рэвалюцыйны настрой, распрыгоньванне ў дзеяннях і выказваннях. Па-чацвёртае, што, на нашу думку, з’яўляецца галоўным, «старая» прафесура вынесла з мінулага верхавенства навукі, карпаратыўнасць і адасобленасць ад усяго і ўсіх. Толькі прыкладна з 1928 г. і назвы вучэбных дысцыплін, і іх змест сталі прадметам кантролю з боку ўніверсітэцкай адміністрацыі і знешніх кантралюючых органаў.

Гісторыяй першабытнага грамадства, Усходу і рэлігій займаўся такі ўніверсальны даследчык, як М. М. Нікольскі. Ён быў літаральна выцягнуты на працу ў БДУ са Смаленскага ўніверсітэта, дзе займаў пасаду рэктара. Гэта ва ўсіх адносінах выдатная асоба: глыбокі даследчык актуальных і сёння навуковых праблем (біблеістыкі, іўдаікі, гісторыі рэлігій, Старажытнага Усходу і інш.), арганізатар навуковага і навучальнага працэсу ў Беларусі (дэкан педагагічнага факультэта БДУ, а пазней дырэктар Інстытута гісторыі АН БССР). Знамянальна, што ў Мінску ён далучыўся да распрацоўкі праблем беларускай гісторыі і этнаграфіі. Дарэчы, у 1920-я гг. М. М. Нікольскі выкладаў разам са сваім даўнім знаёмым У. М. Дзякавым. Гэты навуковы тандэм ужо ў пасляваенны час стварыў падручнік па гісторыі старажытнага часу. У 1933 г. М. М. Нікольскі ў Маскве апублікаваў першы падручнік для 5-га класа сярэдняй школы пад характэрнай назвай «История. Доклассовое общество. Древний Восток. Античный мир», які тут жа быў перавыдадзены ва ўсіх савецкіх рэспубліках.

Вялікай праблемай першага дзесяцігоддзя дзейнасці БДУ была амаль поўная адсутнасць падручнікаў. Іх падрыхтоўка стала абавязкам для гісторыкаў розных кірункаў ведаў. Да вырашэння задачы быў прыцягнуты таксама Інстытут беларускай культуры, у якім першасныя ролі належалі выкладчыкам універсітэта. Напрыклад, па заданню Наркампраса БССР У. І. Пічэта, М. В. Доўнар-Запольскі, В. Д. Дружчыц, Д. І. Даўгяла павінны былі распрацаваць

[10]НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 29.

школьныя вучэбныя карты па перыядах першабытнасці, знаходжання беларускіх зямель у складзе ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Увогуле, праблема падрыхтоўкі падручнікаў знаходзілася ў рэчышчы не толькі навуковых распрацовак, але і эвалюцыі грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне. Калі ў 1920-я гг. у вучэбны працэс БДУ і школ Беларусі ўводзіліся выданні, падрыхтаваныя У. М. Ігнатоўскім, У. І. Пічэтам і іх калегамі, то з канца гэтага дзесяцігоддзя створаная імі вучэбная і часткова навуковая літаратура, якой карысталіся дзясяткі тысяч навучэнцаў, аказалася пад забаронай на доўгія гады.

У 1920-я гг. дамінуючай у савецкай гістарычнай навуцы была так званая школа Пакроўскага, якая амаль цалкам адвяргала неабходнасць вывучэння і навуковай распрацоўкі як сусветнай, так і расійскай гісторыі да XIX ст. Гісторык-бальшавік М. М. Пакроўскі лічыў дакапіталістычную эпоху як пэўныя ўводзіны да «сапраўднай гісторыі» з яе рэвалюцыйнымі пераўтварэннямі. Такі погляд адбіваўся і на даследчыцкіх ініцыятывах гісторыкаў БДУ. У сувязі з гэтым прадстаўленне ў сценах першага беларускага ўніверсітэта агульнай карціны развіцця чалавецтва – і антыказнаўства, і гісторыі рэлігій, і гісторыі Сярэдніх вякоў, і пачатковага этапу новай гісторыі – можна лічыць асабістай заслугай першага пакалення беларускіх гісторыкаў незалежна ад іх паходжання, нацыянальнасці, ранейшай навуковай дзейнасці. Даследчыкам Сярэднявечча і Новага часу стаў прафесар, а потым акадэмік АН БССР У. М. Перцаў. Ён таксама, як і М. М. Нікольскі, Д. А. Жарынаў, У. І. Пічэта, аказаўся ў Мінску «праз Смаленск». Кола яго навуковых інтарэсаў пастаянна пашыралася. У БДУ ён займаўся праблемамі гісторыі Старажытнай Грэцыі, еўрапейскага Сярэднявечча, а потым сканцэтраваў увагу на германістыцы. Цікава, што гэты прызнаны медыявіст адным з першых вызначыў ролю Кастуся Каліноўскага ў гісторыі Беларусі. Пасля манаграфіі У. М. Ігнатоўскага «1863 год на Беларусі: нарыс падзей» (1930) і нядоўгага існавання ва ўладных колах пазітыўнага ўспрыняцця гэтай асобы беларускай гісторыі, а ў грамадстве амаль што яго культу [18, с. 10] У. М. Перцаў зноў звярнуўся да высновы, што К. Каліноўскі – «славный деятель белорусского революционного движения», які «одинаково горячо боролся и против царской России, и против помещичьей Польши и стремился придать революционному движению в Белоруссии самостоятельный республиканский и демократически-крестьянский характер…»[11].

Разам з У. М. Перцавым праблемамі новай і навейшай гісторыі замежных краін у 1920-я гг. займаліся Г. В. Яфімаў і выпускнік педагагічнага факультэта БДУ І. В. Герчыкаў. Апошні яшчэ студэнтам пачаў весці семінарскія заняткі, а потым чытаць лекцыі і друкаваць артыкулы па розных кірунках новай гісторыі. Пазней ён стаў вядомым навістам ва ўніверсітэтах Паволжа.

Храналагічнай мяжой, пасля якой ранейшыя дасягненні беларускай гістарычнай навукі былі скасаваныя, можна лічыць 1928 г. Навукоўцы ў поўнай меры адчулі вялікі перелом, многія аказаліся выкінутымі з прафесіі, некаторым давялося пакінуць Мінск. Спачатку «баластам» і праяўленнем «шматпрадметнасці» палічылі гістарыяграфію, археалогію, гісторыю антычных культур, этнаграфію і мноства іншых дысцыплін у падрыхтоўцы гісторыкаў. Хутка сацыяльна-гістарычнае аддзяленне педагагічнага факультэта зведала бясконцыя змены вучэбных планаў, эксперыменты з методыкамі выкладання, скарачэнне часу навучання. Многія з гісторыкаў былі абвінавачаны ў «нацдэмаўшчыне», абазначаны як «заядлыя праваднікі контррэвалюцыі», «прыхільнікі вялікадзяржаўнага шавінізму» і тэорыі самабытнасці беларускай інтэлігенцыі. Былы рэктар заслужаны прафесар БССР У. І. Пічэта, які быў арыштаваны і заключаны ў ленінградскіх «Крыжах», атрымаў абвінавачванне ў тым, што зрабіў «навуковае абгрунтаванне бязкласавасьці навукі». Пасля выдзялення са структуры БДУ педагагічнага факультэта гістарычная навука ўвогуле перастала быць прадметам выкладання і даследчыцкай дзейнасці.

Між тым універсітэцкія гісторыкі, дзе б яны ні працягвалі працаваць – ці ў БАН, ці ў педінстытуце, – імкнуліся адпавядаць новым стратэгіям на фронце гістарычнай навукі. Напрыклад, М. С. Югаў становіцца ўвасабленнем таго, як гісторык павінен авалодаць марксізмам. У часопісе «Историк-марксист» ён надрукаваў артыкул пад характэрнай назвай «Положение и задачи исторического фронта в Белоруссии», у якім сцвярджаў, што калі ў Расіі «кафедра высшей школы в основном уже завоевана», то ў Беларусі «бедность – чтобы не сказать отсутствие – марксистских сил в области изучения прошлого, почти полная неразработанность огромных периодов истории»[12].

Беларускім гісторыкам патрэбна было прыстасавацца да новых палітычных рэалій. Увасабленнем новых падыходаў стаў будучы першы дэкан гістарычнага факультэта БДУ В. К. Шчарбакоў. У першай палове 1930-х гг. ён увасобіў у сабе дзве іпастасі: з'яўляўся кіраўніком гісторыкаў і быў адказным за новае прачытанне беларускай гісторыі, калі ўлады

[11] Академик В. Перцев. Кастусь Калиновский // Выдающиеся люди Белорус. земли : биобиблиогр. слов. (Рукопись. Из личного архива О. А. Яновского.) / под ред. Т. С. Горбунова, Н. М. Никольского. С. 271.

[12] *Югов М.* Положение и задачи исторического фронта в Белоруссии // Историк-марксист. 1930. Т. 17. С. 41.

поўнасцю адверглі напрацоўкі папярэднікаў. Яму разам з іншымі гісторыкамі была пастаўлена задача падрыхтаваць абагульняючую працу па гісторыі Беларусі, якая б задаволіла афіцыйныя ўлады ў Мінску і Маскве. Гісторыкі ўніверсітэта, зноў аб'яднаныя ў 1934 г. у сценах новага факультэта, сталі аднымі з самых актыўных распрацоўшчыкаў новай канцэпцыі гісторыі Беларусі. Ёй заняліся прадстаўнікі як маладога пакалення (В. К. Шчарбакоў, К. І. Кернажыцкі, К. М. Палікарповіч, М. Я. Грынблат, А. П. П'янкоў і інш.), так і першага складу гісторыкаў БДУ (М. М. Нікольскі, У. М. Перцаў, а пасля рэабілітацыі – У. І. Пічэта і А. А. Савіч). У пасляваенны час да іх далучыліся Л. С. Абэцэдарскі, К. І. Шабуня, А. І. Сідарэнка, М. П. Баранава, М. Б. Фрыдман і інш.

Акрамя пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) «О преподавании гражданской истории в школах СССР», пэўным рубіконам у навуцы, выкладанні і ўспрыняцці мінулага для прафесійных гісторыкаў сталі «Замечания по поводу конспекта учебника по “Истории СССР”» ад 8 жніўня 1934 г. і «Замечания о конспекте учебника “Новой истории”» ад 9 жніўня гэта ж года, якія належалі тагачасным палітычным лідарам савецкай краіны І. В. Сталіну, А. А. Жданаву і С. М. Кіраву. Для рэалізацыі іх установак на фронце гістарычнай навукі з абазначэннем задач ўласнабеларускіх гісторыкаў пад кіраўніцтвам В. К. Шчарбакова было падрыхтавана выданне «Класавая барацьба і гістарычная навука на Беларусі», а таксама зборнікі дакументаў і матэрыялаў па гісторыі Беларусі, дзве часткі якіх В. К. Шчарбакоў складаў разам з К. І. Кернажыцкім, Д. І. Даўгялам, Д. А. Дудковым, І. Ф. Лочмелем, М. М. Нікольскім.

функцыянавання ўрада меншасці нацыяналістаў у Шатландыі. Трэба адзначыць, што брытанская гістарыяграфія гэтага перыяду звычайна канцэнтруецца на праблемах прыстасавання ШНП да новай кіруючай ролі, а таксама на дзейнасці створанага пад яе эгідай форуму «Нацыянальная дыскусія». У сувязі з гэтым неабходна ўзгадаць сумесную працу Дж. Хасана і С. Бэрроў [1] і манаграфію М. Харві [2]. У той жа час дзейнасць юніяніcцкіх партый і іх палітычная барацьба з нацыяналістамі па акрэсленым пытанні застаюцца на перыферыі ўвагі як англамоўных, так і рускамоўных даследчыкаў. Перыяд 2007–2011 гг. з большага апынуўся ў цені наступных падзей, у першую чаргу рэферэндуму па пытанні незалежнасці Шатландыі ў 2014 г. і папярэдняй яму агітацыйнай кампаніі.

Спробай выправіць гэту сітуацыю з'яўляецца дадзены артыкул. Пры падрыхтоўцы быў выкарыстаны шырокі масіў крыніц. Сярод іх можна вылучыць афіцыйныя публікацыі Урада Шатландыі, партыйныя маніфесты асноўных палітычных фігур рэгіёна, даныя сацыялагічных апытанняў і матэрыялы брытанскіх і шатландскіх СМІ. Метадалагічнай асновай працы стала прымяненне гістарычнагенетычнага і параўнальна-гістарычнага метадаў даследавання. Першы з іх дазволіў паказаць развіццё дыскусіі па пытанні будучыні Шатландыі, трансфармацыі гэтай дыскусіі ў цэнтральны пункт парадку дня рэгіёна. Другі метад выкарыстоўваўся пры параўнанні маніфестаў розных палітычных партый дзеля выяўлення асаблівасцей іх пазіцый у дачыненні да статусу рэгіёна.

## Вынікі і іх абмеркаванне

Пасля трэціх выбараў у Халіруд, якія адбыліся 3 мая 2007 г., упершыню да ўлады ў рэгіёне прыйшлі нацыяналісты. Іх лідар А. Сэлманд быў абраны на пасаду першага міністра Шатландыі.

З самага пачатку дзейнасці ШНП актыўна рэалізоўвала перадвыбарныя намеры. Значная частка яе ўвагі канцэнтравалася на дасягненні суверэнітэту Шатландыі. Адным з першых рашэнняў нацыяналістаў стала перайменаванне аднаго з ключавых рэгіянальных органаў кіравання – выканаўчай улады Шатландыі. Ужо з 1 верасня 2007 г. яго афіцыйная назва стала гучаць як «Урад Шатландыі». Па словах лідараў ШНП, гэта сімвалічнае рашэнне павінна было спрыяць больш выразнаму разуменню грамадствам ролі і функцый дадзенага інстытута ўлады [3]. Яшчэ за два тыдні да гэтага, 16 жніўня, нацыяналісты апублікавалі Белую кнігу з відавочнай назвай «Выбар будучыні Шатландыі: нацыянальная дыскусія. Незалежнасць і адказнасць у сучасным свеце»[1]. У гэтым дакуменце сярод іншага гаварылася аб хуткім пачатку працы агульнашатландскага форуму «Нацыянальная дыскусія». У яго рамках планавалася распрацаваць магчымыя праекты развіцця рэгіёна. Акрамя магістральнай тэмы памкненняў нацыяналістаў – дасягнення незалежнасці Шатландыі – перад імі стаяла мэта вынесці на абмеркаванне пытанне аб дэлегаванні дадатковых паўнамоцтваў Халіруда.

Шатландскія нацыяналісты, прадстаўляючы дадзеную Белую кнігу, не забывалі пра тое, што прыхільнікі незалежнасці рэгіёна складаюць меншасць у дзеючым складзе парламента. Улічваючы гэта, не толькі дасягненне суверэнітэту Шатландыі, але і правядзенне рэферэндуму ў бліжэйшай перспектыве было немагчымым. Разам з тым ШНП імкнулася сфармаваць адпаведны інфармацыйны парадак дня. Мэтай партыі было не столькі ў чарговы раз заявіць пра сваю пазіцыю, якая і так была добра вядомая ўсім, колькі садзейнічаць маштабнаму грамадскаму абмеркаванню пытання аб палітычных перспектывах Шатландыі. ШНП прыкладвала намаганні надаць палітычным дэбатам па гэтай праблеме новае дыханне, у тым ліку шляхам інтэграцыі ў абмеркаванне дадатковай альтэрнатывы – умацавання аўтаноміі Шатландыі з дапамогай пашырэння паўнамоцтваў Халіруда. Можна сцвярджаць, што першаснае жаданне нацыяналістаў складалася не ў тым, каб пераканаць шатландцаў абраць суверэнітэт, а ў тым, каб упэўніць грамадскасць у неабходнасці пераканаць іншыя партыі арганізаваць гэты рэферэндум. Партыя выразна разумела, што дачаснае правядзенне такога галасавання можа нездавальняюча скончыцца для прыхільнікаў незалежнасці і толькі адтэрмінаваць жаданы вынік на нявызначаны час[2]. Менавіта таму ШНП вырашыла рухацца паслядоўна, уключаючы ў абмеркаванне палітычных пераўтварэнняў па магчымасці ўсё большую колькасць людзей і выпрацоўваючы канкрэтны спіс прапаноў.

Палітычныя апаненты нацыяналістаў з асцярогай сачылі за гэтай актыўнасцю ШНП. Ключавыя прадстаўнікі юніяніcцкага лагера – рэгіянальныя партыі лейбарыстаў, кансерватараў і ліберал-дэмакратаў – падзялялі меркаванне аб неабходнасці рэагаваць на дзеянні нацыяналістаў. Імкнучыся навязаць свой парадак у пытанні далейшага развіцця Шатландыі, яны ініцыявалі стварэнне адмысловай камісіі экспертаў. Яна павінна была выпрацаваць рэкамендацыі па дэлегаванні дадатковых улад-

[1]Choosing Scotland's future: a national conversation [Electronic resource] // The Scottish Government. 2007. URL: https://www2.gov.scot/Resource/Doc/194791/0052321.pdf (date of access: 08.12.2020). (Тут і далей пераклад наш. – *І. К.*)
[2]Salmond signals delay on Scottish vote over independence party [Electronic resource] // The Guardian. 2007. URL: https://www.theguardian.com/politics/2007/aug/15/scotland.devolution2 (date of access: 08.12.2020).

ных кампетэнцый рэгіянальным органам улады. Першыя кансультацыі кіраўнікоў трох згаданых партый адбыліся ў жніўні 2007 г., праз два тыдні пасля прэзентацыі Белай кнігі нацыяналістаў[3]. Стваральнікі камісіі не адмаўлялі, што вырашылі заснаваць яе для таго, каб перахапіць ініцыятыву ў ШНП. У сваю чаргу крыніцы сярод нацыяналістаў давалі зразумець, што іх задавальняе такое становішча рэчаў[4].

У выніку рашэнне аб заснаванні міжпартыйнай Камісіі па шатландскай дэвалюцыі было прынята 6 снежня 2007 г. Па задумцы стваральнікаў, яна павінна была вывучыць магчымыя сцэнарыі перадачы дадатковых паўнамоцтваў шатландскім рэгіянальным органам улады. Прадстаўнікі юніяністцкіх партый падкрэслівалі, што гэта рашэнне накіравана на «пабудову моцнай і квітнеючай Шатландыі ў складзе моцнай і квітнеючай Брытаніі»[5]. Каментуючы стварэнне міжпартыйнай камісіі, кіраўнік лейбарыстаў В. Аляксандэр заявіла, што эксперты нават не будуць спрабаваць разглядаць незалежнасць Шатландыі як альтэрнатыву, але будуць адкрытыя для ўсіх іншых прапаноў дзеля ўмацавання як дэвалюцыі, так і Злучанага Каралеўства [3].

У 2008 г. рэгіянальныя канстытуцыйныя дыскусіі працягнуліся. У канцы сакавіка створаны па ініцыятыве ШНП форум «Нацыянальная дыскусія» заявіў пра другі этап дзейнасці[6]. Да ўдзелу ў форуме планавалася прыцягнуць прадстаўнікоў розных сфер грамадзянскай супольнасці рэгіёна, а самі пасяджэнні павінны былі прайсці ва ўсіх раёнах Шатландыі. А. Сэлманд прапанаваў узяць удзел у дыскусіі і членам іншых партый, аднак на гэты зварот ніякай рэакцыі не было. Тым часам юніяністцкі лагер абвясціў, што камісію, створаную сумеснымі намаганнямі лейбарыстаў, лібералаў і кансерватараў, узначаліць К. Калман. Першы сход Камісіі па шатландскай дэвалюцыі, ці Камісіі Калмана, як яе празвалі ў СМІ, адбыўся 28 красавіка 2008 г. Меркавалася, што яна прадставіць канчатковы даклад па сутнасці пытання да сярэдзіны 2009 г. [4].

На працягу 2008 г. пытанне аб статусе Шатландыі заставалася адным з цэнтральных. Чарговы ўсплёск цікавасці да гэтай тэмы выклікала публікацыя прамежкавага даклада Камісіі Калмана пад назвай «Будучыня шатландскай дэвалюцыі ў межах саюза» [5]. Даклад закранаў такія тэмы, як сутнасць саюза, паўнамоцтвы Халіруда, яго фінансавую адказнасць і адносіны з Вэстмінстэрам. Нягледзячы на тое што дакумент утрымліваў асобныя рэкамендацыі, ён не прапанаваў новыя рашэнні – эксперты сфармулявалі іх ужо ў сваёй выніковай справаздачы. Адначасова працягваў працу і форум «Нацыянальная дыскусія», да дзейнасці якога сталі ўзнікаць некаторыя пытанні. Так, ён сутыкнуўся са справядлівымі папрокамі ў тым, што не праводзіць ніякіх сур'ёзных даследаванняў патэнцыйных эканамічных, сацыяльных і знешнепалітычных наступстваў незалежнасці. Гэта значна зніжала статус форуму ў вачах шатландцаў, бо такія пытанні асабліва хвалявалі насельніцтва ў кантэксце будучыні рэгіёна [2, p. 163].

З прыходам у другой палове 2008 г. сусветнага фінансавага крызісу градус грамадска-палітычнай дыскусіі ў Шатландыі некалькі знізіўся. Кіраўніцтва ШНП у тагачаснай эканамічнай сітуацыі спрабавала вырашыць новыя задачы. З аднаго боку, партыя павінна была паказаць сваю здольнасць паспяхова кіраваць рэгіёнам ва ўмовах эканамічнай рэцэсіі. Нацыяналісты прасоўвалі тэзіс аб тым, што калі нават з бягучым абмежаваным уладным інструментарыем у іх атрымліваецца дасягнуць пэўных поспехаў, то пры пашырэнні аўтаноміі Шатландыі яе развіццё будзе яшчэ больш дынамічным. З іншага боку, лідары ШНП выдатна ўсведамлялі, што якія-небудзь няўдачы будуць хутчэй выклікаць зніжэнне рэйтынга партыі, чым спрыяць росту папулярнасці ідэі канстытуцыйных пераўтварэнняў. Таму нацыяналісты імкнуліся знайсці залатую сярэдзіну паміж патрабаваннямі дэлегаваць новыя паўнамоцтвы і вырашэннем бягучых праблем. Менавіта для гэтага А. Сэлманд наракаў на вядомыя хібы існуючага ладу і намякаў на неабходнасць перадачы новых паўнамоцтваў, адначасова імкнучыся не нашкодзіць іміджу свайго ўрада. У той жа час прыхільнікі незалежнасці не саромеліся звяртаць увагу на сур'ёзныя эканамічныя цяжкасці, якія могуць чакаць суверэнную Шатландыю падчас падобнага крызісу. Яны імкнуліся ўкараніць уяўленне пра тое, што толькі пры ўмове захавання адзінага Злучанага Каралеўства ёсць магчымасць устойліва супрацьстаяць негатыўным тэндэнцыям глабальнай эканомікі.

Фінальны даклад Камісіі па шатландскай дэвалюцыі на чале з К. Калманам быў прадстаўлены 15 чэрвеня 2009 г. [6]. Ён утрымліваў мноства рэкамендацый па паляпшэнні эфектыўнасці працы шатландскіх органаў улады і іх узаемадзеянні з агульнабрытанскімі інстытутамі. Прадугледжвалася

[3]Opposition parties discuss new Holyrood powers [Electronic resource] // The Guardian. 2007. URL: https://www.theguardian.com/politics/2007/aug/29/scotland.devolution (date of access: 08.12.2020).

[4]Unionists team up to steal SNP thunder over Holyrood powers [Electronic resource] // The Scotsman. 2007. URL: https://www.scotsman.com/news/politics/unionists-team-up-to-steal-snp-thunder-over-holyrood-powers-1-1422678 (date of access: 08.12.2020).

[5]Scottish tax move aims to stop demands for independence vote [Electronic resource] // The Guardian. 2007. URL: https://www.theguardian.com/politics/2007/dec/07/uk.scotland (date of access: 08.12.2020).

[6]SNP bets on the small businessman [Electronic resource] // The Guardian. 2008. URL: https://www.theguardian.com/uk/2008/mar/23/scotland.scotland (date of access: 08.12.2020).

значнае павелічэнне фінансавай аўтаноміі Шатландыі, асабліва ў сферы падаткаабкладання, рэкамендавалася передача шматлікіх дадатковых паўнамоцтваў у галінах адукацыі, правапарадку, аховы навакольнага асяроддзя, інфармацыйнай палітыкі[7]. Рэакцыя на публікацыю фінальнага даклада камісіі была дастаткова сумбурная. Прэса вітала грунтоўнасць падыходу камісіі, але юніяністкія партыі заявілі пра тое, што ім неабходны час, каб сфармаваць меркаванне аб прадстаўленых выніках даследавання.

Адначасова з гэтым завяршалася праца форуму «Нацыянальная дыскусія». За перыяд яго дзейнасці было праведзена больш за 40 тэматычных сходаў практычна ва ўсіх раёнах Шатландыі[8]. Галоўным вынікам працы стала прэзентацыя тэзісаў, у якіх раскрывалася меркаванне розных арганізацый і сацыяльных груп у дачыненні да палітычных перспектыў рэгіёна[9]. Арганізатары форуму сістэматызавалі ўсе выпрацаваныя ідэі ў адмысловым выніковым дакуменце «Нацыянальная дыскусія: ваша Шатландыя, ваш голас», які быў прадстаўлены 30 лістапада 2009 г. Сярод іншага ў дакуменце агучваўся намер у пачатку наступнага года прадставіць законапраект аб правядзенні рэферэндуму аб незалежнасці Шатландыі, а таксама запрашэнне ўсім зацікаўленым бакам далучыцца да яго распрацоўкі [7]. Тым не менш трэба адзначыць, што вынікі працы ініцыяванага нацыяналістамі форуму былі супярэчлівымі. Да яго заслуг можна аднесці вывядзенне дыскусіі аб патэнцыяльнай будучыні рэгіёна на новы ўзровень. Менавіта дзякуючы форуму свае ўяўленні пра перспектывы развіцця Шатландыі змаглі прэзентаваць прадстаўнікі розных сацыяльных і тэрытарыяльных груп. У той жа час ключавая мэта нацыяналістаў не была рэалізавана. Сацыяльныя апытанні паранейшаму паказвалі адносна невысокі ўзровень падтрымкі ідэі суверэннай Шатландыі [8]. Улічваючы існуючыя абставіны, ШНП не магла спадзявацца на ўхваленне парламентам праекта біля аб арганізацыі рэферэндуму. Нацыяналісты былі вымушаныя прызнаць несвоечасовасць такога галасавання[10].

Складанасці ў эканамічнай сферы ў другой палове 2010 г. сталі прычынай адыходу пытання аб статусе Шатландыі на перыферыю ўвагі. ШНП была вымушана сфакусіравацца на пераадоленні негатыўных наступстваў фінансавага крызісу. Апазіцыйныя партыі таксама не імкнуліся абвастраць сітуацыю. Яны асцерагаліся магчымага палітычнага крызісу і датэрміновых выбараў у Халіруд, якія маглі прывесці да ўпэўненай перамогі нацыяналістаў. Асноўныя палітычныя сілы вырашылі акумуляваць энергію, чакаючы пачатку кампаніі па выбарах у парламент Шатландыі, якая павінна была стартаваць вясной 2011 г.

ШНП падыходзіла да чарговых выбараў у Халіруд у якасці галоўнага фаварыта. На партыйным з’ездзе ў кастрычніку 2010 г. лідар нацыяналістаў першы міністр Шатландыі А. Сэлманд пацвердзіў накіраванасць ШНП на дасягненне незалежнасці рэгіёна[11]. Перадвыбарная праграма партыі была прадстаўлена ў маніфесце, апублікаваным за два тыдні да выбараў [9]. Нацыяналісты зноў заявілі пра гатоўнасць у выпадку перамогі на выбарах правесці рэферэндум, на якім будзе вынесена пытанне аб незалежнасці Шатландыі.

У адрозненне ад нацыяналістаў юніяністкія партыі не адважыліся адкрыта артыкуляваць сваю пазіцыю па гэтым пытанні. Лейбарысты і кансерватары вырашылі ў прынцыпе не закранаць яго ў сваіх маніфестах [10; 11]. Аналагічна паступілі і ліберал-дэмакраты. Яны не сфармулявалі партыйную пазіцыю па гэтай праблеме ў перадвыбарным дакуменце, хоць і заявілі пра гатоўнасць да дыялогу з усімі зацікаўленымі бакамі [12]. Такім чынам, ні адна з партый юніяністкага лагера не адважылася скарыстацца распрацоўкамі Камісіі Калмана ў якасці інструмента электаральнай барацьбы.

Па выніках чацвёртых рэгіянальных выбараў нацыяналісты гарантавалі сабе 69 з 129 месцаў у новым складзе парламента. Тым самым упершыню ў гісторыі Халіруда адна партыя змагла дамагчыся парламенцкай большасці і атрымаць права самастойна сфармаваць паўнавартасны ўрад. Шатландыя ўступіла ў якасна новы этап палітычнага развіцця.

## Заключэнне

На працягу ўсіх чатырох гадоў кіравання рэгіёнам у якасці ўрада меншасці ШНП ўдавалася праводзіць адносна паспяховую ўнутраную палітыку, не забываючы пра рух да рэалізацыі галоўнай мэты – дасягнення незалежнасці. Істотнай асаблівасцю гэтага часу стала актывізацыя грамадскай дыскусіі па

[7]Calman commission: let Scotland keep bigger tax slice [Electronic resource] // The Guardian. 2008. URL: https://www.theguardian.com/politics/2009/jun/14/calman-commission-scotland-financial-independence-devolution (date of access: 08.12.2020).
[8]National Conversation Meetings [Electronic resource] // The Scottish Government. 2009. URL: https://web.archive.org/web/20191014074748/https://www2.gov.scot/Topics/constitution/a-national-conversation/map (date of access: 08.12.2020).
[9]Contributions [Electronic resource] // The Scottish Government. URL: https://web.archive.org/web/20191014074743/https://www2.gov.scot/Topics/a-national-conversation/NC-contributions-inds-org (date of access: 08.12.2020).
[10] SNP ministers set to back plans to shelve independence referendum [Electronic resource] // The Guardian. 2010. URL: https://www.theguardian.com/politics/2010/sep/06/snp-plan-shelve-independence-referendum (date of access: 08.12.2020).
[11] Full independence will save Scotland from worst of cuts, says Alex Salmond [Electronic resource] // The Guardian. 2010. URL: https://www.theguardian.com/politics/2010/oct/17/alex-salmond-scotland-independence-cuts (date of access: 08.12.2020).

пытанні аб будучыні Шатландыі. ШНП з дапамогай свайго агульнанацыянальнага форуму стымулявала шырокія дэбаты аб статусе рэгіёна і канчаткова пераўтварыла іх у адну з галоўных тэм палітычнага жыцця Шатландыі. Нягледзячы на сур'ёзныя эканамічныя складанасці, выкліканыя сусветным фінансавым крызісам, гэта дыскусія развівалася ў выгадным для ШНП напрамку. Рэагуючы на рост папулярнасці нацыяналістаў, іх палітычныя апаненты – лейбарысты, ліберал-дэмакраты і кансерватары – былі вымушаныя скарэкціраваць свае пазіцыі па многіх важных момантах, у тым ліку наконт пашырэння самакіравання Шатландыі. Яны стварылі альтэрнатыўную арганізацыю – Камісію Калмана – з мэтай распрацоўкі рэкамендацый па пераглядзе існуючага палітычнага ладу. Не будзе перабольшаннем сцвярджаць, што гэта рашэнне дэманстравала важнейшы паварот у шатландскай палітыцы. З таго часу ўсе прадстаўнікі партыйнай сістэмы Шатландыі былі згодныя з пераглядам уладнай кампетэнцыі Халіруда ў бок яе пашырэння. Аднак канкрэтныя ўмовы такога перагляду кожны з лагераў прадстаўляў па-свойму. Дыскусія па пытанні аб статусе Шатландыі павінна была працягнуцца ўжо ў наступны тэрмін дзейнасці Халіруда. Іншым вызначальным вынікам унутрыпалітычнай барацьбы ў 2007–2011 гг. стала паспяховая трансфармацыя нацыяналістаў у партыю ўлады, што само па сабе прывяло да змены характару гэтай барацьбы. ШНП выступіла ў якасці праактыўнай сілы, якая самастойна прасоўвае і фарміруе выгадны для сябе парадак дня. Астатнія партыі неаднаразова былі вымушаныя падстройвацца і рэагаваць на яе ініцыятывы ўжо пастфактум. У нацыяналістаў таксама атрымалася прадэманстраваць насельніцтву сваю кампетэнтнасць у якасці кіруючай партыі. Іх дзейнасць на чале ўрада меншасці была станоўча ацэнена насельніцтвам, відавочным пацвярджэннем чаго сталі рэгіянальныя выбары 2011 г.

## References

1. Hassan G, Barrow S. *A Nation changed? The SNP and Scotland ten years on*. Edinburgh: Luath Press; 2017. 368 p.

2. Harvey M. *Conversing with the nation: consultations and referendums in Scotland and Wales under devolution*. Stirling: University of Stirling; 2014. 319 p.

3. Paun A, editor. Nations and regions. The dynamics of devolution. Scotland quarterly report. September 2007 [Internet]. *The Constitution Unit*. 2007 [cited 2021 July 28]. Available from: https://www.ucl.ac.uk/constitution-unit/sites/constitution-unit/files/scotland07.pdf#page=188.

4. McEwen N, editor. Nations and regions. The dynamics of devolution. Scotland quarterly report. May 2008 [Internet]. *The Constitution Unit*. 2008 [cited 2021 July 28]. Available from: https://www.ucl.ac.uk/constitution-unit/sites/constitution-unit/files/scotland08.pdf#page=111.

5. Cairney P, editor. Nations and regions. The dynamics of devolution. Scotland quarterly report. January 2009 [Internet]. *The Constitution Unit*. 2009 [cited 2021 July 28]. Available from: https://www.ucl.ac.uk/constitution-unit/sites/constitution-unit/files/scotland09.pdf.

6. Cairney P, editor. Nations and regions. The dynamics of devolution. Scotland quarterly report. September 2009 [Internet]. *The Constitution Unit*. 2009 [cited 2021 July 28]. Available from: https://www.ucl.ac.uk/constitution-unit/sites/constitution-unit/files/scotland09.pdf#page=165.

7. Your Scotland, your voice. A national conversation [Internet]. *BBC*. 2009 [cited 2020 February 15]. Available from: http://news.bbc.co.uk/2/shared/bsp/hi/pdfs/30_11_09_referendum.pdf.

8. Ormston R, Reid S. Scottish Social Attitudes Survey 2010. Core module – attitudes to government, the economy and public services in Scotland [Internet]. *The Scottish Government*. 2011 [cited 2021 July 28]. Available from: https://www.webarchive.org.uk/wayback/archive/20170107022402/http://www.gov.scot/Publications/2011/06/29152407/13.

9. Re-elect: a Scottish Government working for Scotland [Internet]. *Land Matters*. 2011 [cited 2020 February 15]. 44 p. Available from: http://www.andywightman.com/docs/SNP_Manifesto_2011.pdf.

10. *Fighting for What Really Matters – Scottish Labour Party Manifesto 2011 Scottish Parliament Election*. Glasgow: Scottish Labour Party; 2011. 98 p.

11. *Common Sense for Scotland – Scottish Conservatives – Scottish Parliament Election Manifesto 2011*. Edinburgh: Scottish Conservatives and Unionist Party; 2011. 36 p.

12. *Solutions for Scotland – Scottish Liberal Democrats – Scottish Parliament Election Manifesto 2011*. Edinburgh: Scottish Liberal Democrats; 2011. 83 p.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 24.12.2020.*
*Received by editorial board 24.12.2020.*

УДК 719.03(476.6)

# СТАНОВЛЕНИЕ ПАМЯТНИКООХРАННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ В БССР В ПЕРИОД «ОТТЕПЕЛИ» (1953–1968)

***А. А. ГУЖАЛОВСКИЙ***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Анализируется изменение государственной политики, а также возрождение общественной инициативы в области охраны памятников культуры, что было обусловлено либерализацией общественно-политической жизни в БССР в годы «оттепели». Публичные выступления деятелей культуры, ученых, преподавателей, журналистов послужили толчком к действиям руководителей республиканских и местных государственных органов, решавших судьбы конкретных объектов национального наследия. Результатом усилий государства и общества, приложенных на протяжении рассматриваемого периода, стало создание Белорусского добровольного общества охраны памятников истории и культуры (1966), Государственной инспекции по охране памятников истории, искусства, архитектуры и археологии (1967), а также принятие закона «Об охране памятников культуры» (1969).

***Ключевые слова:*** культурное наследие; охрана памятников; государственная политика; общественная инициатива; реставрация.

**Образец цитирования:**
Гужалоўскі АА. Станаўленне помнікаахоўнай дзейнасці ў БССР у перыяд «адлігі» (1953–1968). *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2021;3:86–96.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2021-3-86-96

**For citation:**
Huzhalouski AA. Formation of monument protection activities in Soviet Belarus in the years of «thaw» (1953–1968). *Journal of the Belarusian State University. History.* 2021;3:86–96. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2021-3-86-96

**Автор:**
***Александр Александрович Гужаловский*** – доктор исторических наук, профессор; профессор кафедры этнологии, музеологии и истории искусств исторического факультета.

**Author:**
***Alexander A. Huzhalouski***, doctor of science (history), full professor; professor at the department of ethnology, museology and history of art, faculty of history.
*huzhalouski@gmail.com*



CC BY NC

# СТАНАЎЛЕННЕ ПОМНІКААХОЎНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў БССР У ПЕРЫЯД «АДЛІГІ» (1953–1968)

***А. А. ГУЖАЛОЎСКІ***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Прыводзіцца аналіз змянення дзяржаўнай палітыкі, а таксама адраджэння грамадскай ініцыятывы ў галіне аховы помнікаў культуры, што было абумоўлена лібералізацыяй грамадска-палітычнага жыцця ў БССР у гады «адлігі». Публічныя выступленні дзеячаў культуры, навукоўцаў, выкладчыкаў, журналістаў паслужылі штуршком да дзеянняў кіраўнікоў рэспубліканскіх і мясцовых дзяржаўных органаў, якія вырашалі лёсы канкрэтных аб’ектаў нацыянальнай спадчыны. Вынікам намаганняў дзяржавы і грамадства, прыкладзеных на працягу разгледжанага перыяду, стала стварэнне Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (1966), Дзяржаўнай інспекцыі па ахове помнікаў гісторыі, мастацтва, архітэктуры і археалогіі (1967), а таксама прыняцце закона «Аб ахове помнікаў культуры» (1969).

***Ключавыя словы:*** культурная спадчына; ахова помнікаў; дзяржаўная палітыка; грамадская ініцыятыва; рэстаўрацыя.

# FORMATION OF MONUMENT PROTECTION ACTIVITIES IN SOVIET BELARUS IN THE YEARS OF «THAW» (1953–1968)

***A. A. HUZHALOUSKI***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The author analyses the change in state policy, as well as the revival of public initiative in the field of protection of cultural monuments, as a result of the liberalisation of social and political life in Soviet Belarus during the «thaw». Public speeches of cultural figures, scientists, teachers, journalists served as an impetus for the actions of republican and local state bodies, who decided the fate of national heritage objects. The state officials and society representatives efforts undertaken during the period under review resulted with the creation of the Belarusian voluntary society for the protection of historical and cultural monuments (1966), the State inspectorate for the protection of historical, artistic, architectural and archaeological monuments (1967), as well as with the adoption of «On the protection of cultural monuments» law (1969).

***Keywords:*** cultural heritage; protection of monuments; state policy; public initiative; restoration.

У пасляваенны час абавязкі па захаванні помнікаў у БССР былі падзелены паміж Камітэтам па справах культасветустаноў і двума ўпраўленнямі пры Савеце Міністраў БССР – па справах архітэктуры і па справах мастацтва. Першае ведамства адказвала за помнікі гісторыі і археалогіі, два іншых – за помнікі архітэктуры і мастацтва. Высілкі дзяржаўных кіруючых структур па захаванні помнікаў культуры дапоўнілі ініцыятывы, якія сыходзілі ад навуковых і навучальных устаноў. Загадчык сектара мастацтва М. С. Кацар праводзіў вывучэнне і фотафіксацыю помнікаў архітэктуры з 1946 г. у складзе Інстытута літаратуры, мовы і мастацтва АН БССР, а з 1957 г. – Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР[1]. У 1954 г. на занядбаныя каштоўныя помнікі архітэктуры звярнуў увагу выкладчык кафедры архітэктуры Беларускага політэхнічнага інстытута імя І. В. Сталіна У. А. Чантурыя, які з актыўнай дапамогай студэнтаў распачаў іх даследаванне[2].

Гэтая дзейнасць атрымала нарматыўны падмурак у выглядзе пастановы Савета Міністраў БССР ад 15 лютага 1949 г. № 132[3], у адпаведнасці з якой адказныя ведамствы абавязаны правесці інвентарызацыю помнікаў, забяспечыць іх ахову і належнае выкарыстанне. З мэтай каардынацыі дадзенай дзейнасці тады ж пры прэзідыуме АН БССР быў створаны Навукова-метадычны савет па ахове помнікаў культуры на чале з прэзідэнтам М. І. Грашчанковым[4]. Аднак ва ўмовах занядбання помнікаў, абмежаванай колькасці і невысокай прафесійнай кваліфікацыі музейных супрацоўнікаў і будаўнікоў,

[1]Цэнтр. навук. арх. Нац. акад. навук Беларусі (ЦНА НАН). Ф. 11. Воп. 1. Спр. 14. Арк. 1.
[2]*Чантурыя У.* Помнікі гісторыі і жывое жыццё // Літ. і мастацтва. 1966. 11 студз. (№ 4). С. 2.
[3]О мерах улучшения охраны памятников культуры в Белорусской ССР : постановление Совета Министров БССР от 15 февр. 1949 г. № 132 // Собр. действующего законодательства Белорус. ССР. Разд. XXI. Законодательство о культуре. Минск, 1979. С. 98–99.
[4]ЦНА НАН. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 513. Арк. 187.

якія ажыццяўлялі практычныя ўліковыя і кансервацыйныя мерапрыемствы, супрацьдзеянне гаспадарнікаў розным ахоўным аперацыям выканаць гэтыя патрабаванні ў поўным аб'ёме было немагчыма.

У 1950 г. у рэчышчы рэалізацыі названай пастановы Савет Міністраў БССР зацвердзіў наступныя дакументы: спіс археалагічных помнікаў (складаўся з 8 аб'ектаў саюзнага значэння і 127 – рэспубліканскага), спіс гістарычных помнікаў (уключаў у сябе 24 аб'екты саюзнага значэння і 71 – рэспубліканскага)[5]. У 1953 г. гэтыя дакументы былі дапоўнены спісам помнікаў архітэктуры, якія падлягалі ахове (прадстаўлены 82 аб'ектамі сакральнай архітэктуры і палацава-паркавага мастацтва)[6]. Нарэшце ў жніўні 1957 г. з'явіўся абноўлены, пашыраны да 483 гістарычных і 131 археалагічнага аб'ектаў «Спіс гістарычных помнікаў на тэрыторыі БССР»[7].

Пачынаючы з сярэдзіны 1950-х гг. узрасла цікавасць да пытанняў аховы і выкарыстання гістарычных помнікаў, што было часткаю агульнага працэса дэмакратызацыі жыцця краіны, павелічэння цікаўнасці да айчыннай культуры, пашырэння турыстычнага руху. Неўзабаве пасля смерці І. В. Сталіна грамадскую дыскусію пра стан беларускай архітэктурнай спадчыны распачалі старэйшы архітэктар па ахове помнікаў Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах архітэктуры і будаўніцтва І. Б. Элентух і старэйшы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага мастацкага музея БССР С. Д. Палеес. Пасля кансервацыйна-рэстаўрацыйных работ у Сафійскім саборы і Спаса-Ефрасіннеўскай царкве ў Полацку, Камянецкай вежы, Нясвіжскім замку, палацы Румянцавых – Паскевічаў і Магілёўскай ратушы[8] навукоўцы звярнулі ўвагу на дрэнны стан Мірскага замка, які патрабаваў тэрміновай кансервацыі. У адпаведнасці са службовымі абавязкамі І. Б. Элентух і С. Д. Палеес праводзілі гісторыка-архітэктурныя даследаванні, на падставе якіх яны маглі казаць пра патрэбу выконвання кансервацыйных работ у Гальшанскім замку, Чачэрскай ратушы, Доме рамесніка ў Нясвіжы, касцёле Святога Яна Хрысціцеля ў Камаях і інш. У сваім артыкуле І. Б. Элентух і С. Д. Палеес згадалі пра ўзарваны напярэдадні касцёл Святога Станіслава ў Пінску, прычыну здарэння яны патлумачылі «безадказнасцю былога начальніка Пінскага абладдзела па справах архітэктуры»[9].

Распачатую прафесіяналамі дыскусію аб стане нацыянальнай архітэктурнай спадчыны падтрымалі грамадзяне, далёкія ад гэтай сферы. Заатэхнік Обрынскай МТС Мірскага раёна К. Мірачыцкі працягнуў абмеркаванне праблемы захаванасці галоўнага помніка яго малой радзімы: «На жаль, Мірскі замак знаходзіцца ў запушчаным стане. Пакоі забруджаны, сцены і дах разбураюцца ад дажджу»[10]. Неўзабаве аб'ектам грамадскай крытыкі зрабіліся спробы ўлады аднаўляць помнікі, дзеля чаго ва ўмовах адсутнасці рэспубліканскай рэстаўрацыйнай службы прыцягваліся будаўнічыя арганізацыі. Напрыклад, у 1955 г. «рамонт» гомельскага палаца Румянцавых – Паскевічаў з парушэннямі асноўных прынцыпаў рэстаўрацыі ажыццяўляла будаўнічамантажнае ўпраўленне трэста № 9 Міністэрства гарадскога і сельскага будаўніцтва[11].

Новая хваля грамадскай актыўнасці, накіраваная на захаванне нацыянальнай культурнай спадчыны, узнікла ў выніку лібералізацыі грамадскапалітычнага жыцця пасля правядзення XX з'езда КПСС. У выданні «Литературная газета» 23 жніўня 1956 г. быў надрукаваны калектыўны ліст, падпісаны знакамітымі савецкімі дзеячамі навукі і культуры[12]. У ім утрымліваўся заклік да абароны помнікаў, канстатавалася неэфектыўнасць дзяржаўнай сістэмы аховы культурнай спадчыны, што склалася ў краіне. Выйсце з гэтай сітуацыі аўтары калектыўнага ліста бачылі ў прыцягненні ў сферу помнікаахоўнай дзейнасці шырокай грамадскасці, інстытуцыйна арганізаванай ва Усесаюзнае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў культуры.

Пасля з'яўлення ў друку гэты зварот абмяркоўваўся на адмысловым сходзе ў Інстытуце гісторыі АН БССР. Выступоўцы згадалі шматлікія выпадкі варварскіх адносін да беларускай культурнай спадчыны, у тым ліку да Мінскага замчышча, Барысаглебскай царквы ў Гродне, Барысавых камянёў на Заходняй Дзвіне, магілы Кастуся Каліноўскага на гары Гедыміна і інш. Гучала крытыка не толькі ў дачыненні да Міністэрства культуры БССР і Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах архітэктуры і будаўніцтва, але таксама да створанага напярэдадні Навукова-метадычнага савета па ахове помнікаў культуры пры прэзідыуме АН БССР пад кіраўніцтвам віцэ-прэзідэнта І. С. Лупіновіча. Напрыканцы ўдзельнікі сходу сфармавалі ініцыя-

[5]Советское законодательство о памятниках истории и культуры : сб. докл. и материалов (1917–1972) / Белорус. добровол. о-во охраны памятников истории и культуры. Минск : Полымя, 1972. С. 120–160.
[6]Там же. С. 336–342.
[7]Там же. С. 161–276.
[8]Магілёўская ратуша была ўзарвана ў ліпені 1957 г.
[9]*Элентух І., Палеес С.* Клапатліва ахоўваць помнікі архітэктуры // Літ. і мастацтва. 1953. 30 мая (№ 22). С. 4.
[10]*Мірачыцкі К.* Захаваць замак у Міры // Там жа. 1954. 11 верас. (№ 37). С. 4.
[11]*Разінскі Г.* Аднаўленчыя работы праводзяцца марудна // Там жа. 1955. 6 жн. (№ 33). С. 4.
[12]*Воронин Н., Грабарь И., Дорош Е., Корин П., Михайлов Б., Петровский И. и др.* В защиту памятников культуры // Лит. газета. 1956. 23 авг. (№ 100). С. 1.

тыўную групу па стварэнні беларускага аддзялення Усесаюзнага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў культуры[13].

У абарону нацыянальнай спадчыны з калектыўным лістом 20 кастрычніка 1956 г. выступілі выбітныя дзеячы беларускай навукі і культуры. Яны прапанавалі адкрыць адзіны дзяржаўны цэнтр па ахове помнікаў, узмацніць адміністратыўную і крымінальную адказнасць за іх псаванне, павялічыць фінансаванне рэстаўрацыйных работ. Аўтары ліста таксама ўказалі на неабходнасць стварэння асобнага музея для захавання народнага драўлянага дойлідства[14]. Сярод тых, хто падпісаў калектыўны зварот беларускай інтэлігенцыі да ўлад, быў М. С. Кацар. У тым жа годзе ён выдаў кнігу, у якой у навукова-папулярнай форме распавядалася пра эвалюцыю дойлідства ў Беларусі са старажытных часоў да пачатку XX ст. і паспрыяла вяртанню архітэктурнай спадчыны ў цэнтр грамадскай увагі [1].

Пераломны 1956 г. скончыўся вандроўкай у Полацк С. Х. Александровіча, выкладчыка Мінскага бібліятэчнага тэхнікума, і В. Р. Тарасенка, навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі АН БССР. У змешчаным імі ў друку крытычным артыкуле, які быў напісаны па выніках вандроўкі, распавядалася пра агульную культурную занядбанасць старажытнага беларускага горада. Два будынкі, што афіцыйна атрымалі статус помніка – домік Пятра І і Полацкі езуіцкі калегіум, – знаходзіліся ў дрэнным стане. Полацкі краязнаўчы музей, змешчаны ў лютэранскай кірсе, не ацяпляўся, не меў грошай на правядзенне археалагічных раскопак і нават не згадваў у сваёй экспазіцыі імя беларускага першадрукара. Затое адзін са змрочных, ускраінных завулкаў здзівіў падарожнікаў сваёй назвай «Скарынская вуліца»[15]. Вятры змен вымагалі ад полацкіх улад апературыўнай рэакцыі на гэту крытыку. Ужо праз тры тыдні пасля яе з'яўлення Полацкі гарсавет адрапартаваў пра добраўпарадкаванне вала Івана Грознага, рамонт музея і рашэнне надаць мясцоваму педінстытуту імя Ф. Скарыны[16].

У 1957 г. у галіне аховы культурнай спадчыны з'явіліся новыя грамадскія ініцыятывы, найбольш заўважная з іх у форме яшчэ аднаго калектыўнага ліста інтэлігенцыі, падпісанага ўплывовымі асобамі на чале з прэзідэнтам АН БССР В. Ф. Купрэвічам. У гэтым лісце ў больш эмацыйна афарбаванай форме («немагчыма больш мірыцца са злачыннай абыякавасцю да нацыянальных святыняў») даваліся прапановы арганізацыйнага характару па ахове культурнай спадчыны, ужо выказаныя ў калектыўным лісце 1956 г.[17] Усё часцей гучалі новыя рэкамендацыі па пашырэнні спіса аб'ектаў, што падлягалі ахове. Адну з іх выказаў загадчык навучальнай часткі Косаўскага дзіцячага дома В. Мароз, прапанаваўшы рэстаўрыраваць Косаўскі палац і аднавіць дом у Мерачоўшчыне, дзе нарадзіўся Т. Касцюшка[18]. Публікацыі ў СМІ, кніжныя выданні [2–4] і выставачныя праекты спрыялі распаўсюджанню ідэі грамадскай каштоўнасці архітэктурнай спадчыны[19].

У 1958 г. у ЦК КПСС з удзелам прадстаўнікоў Акадэміі навук СССР і дзеячаў культуры адбылося абмеркаванне законапраекта аб ахове помнікаў. Практычным вынікам гэтай падзеі стала арганізацыя ў тым жа годзе на базе шэрагу расійскіх музеяў першых музеяў-запаведнікаў, а таксама падрыхтоўка да турыстычнага агляду найбольш значных архітэктурных помнікаў. У БССР дадзеныя дзеянні адгукнуліся пашпартызацыяй помнікаў гісторыі, археалогіі і мастацтва, якая пачалася ў 1959 г. Адказнасць за правядзенне гэтых работ загадам Міністэрства культуры БССР была ўскладзена на абласныя гісторыка-краязнаўчыя музеі. Паралельна з пашпартызацыяй супрацоўнікі музеяў павінны былі «сістэматычна весці назіранні за захаванасцю помнікаў, паведамляць аб спробах зносу альбо вядзення раскопак без адкрытага ліста»[20]. Жыццё паказала, што ва ўмовах абмежаванай колькасці і невысокай кваліфікацыі супрацоўнікаў выканаць гэтае патрабаванне ў поўным аб'ёме абласныя музеі не былі здольныя.

Праблему захавання старажытнай архітэктуры, пошуку балансу паміж ёю і новымі тыпавымі кварталамі абвастрыла актыўная забудова гарадоў у перыяд сямігодкі (1959–1965). Праявай новага стаўлення да помнікаў з боку дзяржавы было з'яўленне у 1959 г. у прынятых Саветам Міністраў БССР «Правілах забудовы гарадоў Беларускай ССР» раздзела «Аб помніках культуры», у якім, у прыватнасці, падкрэслівалася неабходнасць сачыць за збераджэннем існаваўшых помнікаў культуры падчас правядзення будаўнічых работ. Асобным пунктам дакумент абавязваў гарадскія выканаўчыя камітэты ўсталёўваць вакол помнікаў ахоўныя зоны[21].

---

[13] *Гринблат М., Корнейчик Е., Поболь Л.* Беречь памятники старины // Сов. Белоруссия. 1956. 27 сент. (№ 226). С. 2.

[14] *Нікольскі М., Глебка П., Пестрак П., Цікоцкі Я., Уладамірскі У., Кацар М. і інш.* У абарону помнікаў культуры // Літ. і мастацтва. 1956. 20 кастр. (№ 43). С. 1.

[15] *Александровіч С.* Горад гістарычных помнікаў // Літ. і мастацтва. 1956. 20 кастр. (№ 43). С. 3.

[16] Па слядах нашых выступленняў // Там жа. 1956. 15 снеж. (№ 51). С. 4.

[17] *Купревич В., Крапива К., Перцев В., Глебка П., Павлов В., Кацер М. и др.* Еще раз в защиту памятников культуры. Письмо в редакцию // Сов. Белоруссия. 1957. 11 июля (№ 162). С. 3. (Пераклад наш. – *А. Г.*)

[18] *Мароз В.* Забыты архітэктурны помнік // Літ. і мастацтва. 1957. 27 лют. (№ 17). С. 3.

[19] *Тарасікаў М.* Помнікі ў малюнках // Там жа. 1960. 16 сак. (№ 22). С. 4.

[20] Нац. арх. Рэсп. Беларусь (НАРБ). Ф. 974. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 255.

[21] Правілы забудовы гарадоў Беларускай ССР // Зб. законаў, указаў Прэзідыума Вярх. Савета Беларус. ССР, пастаноў і распараджэнняў Савета Міністраў Беларус. ССР. 1959. № 18. С. 495.



Нясвіжскі замак. 1950-я гг.
Niasvizh Castle. 1950s



Ружанскі палац. 1950-я гг.
Ruzhany Palace. 1950s

Крыніца: Аддзел старажытнабеларускай культуры ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі» (архіў М. С. Кацара, скрынка № 26)



Мірскі замак. 1950-я гг.
Mir Castle. 1950s



Палац у Шчорсах. 1950-я гг.
Shchorsy Palace. 1950s

Крыніца: Аддзел старажытнабеларускай культуры ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі» (архіў М. С. Кацара, скрынка № 26)



Камянецкая вежа. 1950-я гг.
Kamjanets Tower. 1950s



Магілёўская ратуша. 1950-я гг.
Mahilioŭ Townhall. 1950s



Мікалаеўская царква ў Магілёве. 1950-я гг.
St. Michael Church in Mahilioŭ. 1950s

Крыніца: Аддзел старажытнабеларускай культуры ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі» (архіў М. С. Кацара, скрынка № 26)

Пра супярэчнасць, непаслядоўнасць дзяржаўнай палітыкі хрушчоўскага кіраўніцтва ў галіне аховы помнікаў сведчаць урадавыя распараджэнні па скарачэнні фінансавання рэстаўрацыйных работ, пададзеных як «празмернасць» на пленуме ЦК КПСС, што адбыўся ў студзені 1961 г. У Мінску барацьба з «празмернасцямі» ўвасобілася ў пастанове Савета Міністраў БССР ад 20 верасня 1961 г., згодна з якой са спіса помнікаў архітэктуры выключылі Дабравешчанскую царкву XII ст. у Віцебску, Троіцкі касцёл 1615–1617 гг. у Ружанах, касцёл Св. Стэфана (Мікалаеўскі сабор) першай паловы XVIII ст. у Полацку, касцёл Адшукання Св. Крыжа і кляштар бернардзінцаў XVI–XVII стст. у Гродне, Свята-Троіцкую праваслаўную царкву 1842 г. у Саматэвічах Касцюковіцкага раёна, уніяцкую царкву Пятра і Паўла XVIII ст. у Рыжкавічах Шклоўскага раёна[22].

Акрамя храмаў, паводле планаў беларускага ўрада, у недалёкай камуністычнай будучыні былі павінны знікнуць напаўразбураныя Любчанскі замак другой паловы XVI ст., палац Сапегаў XVII–XVIII стст. у Ружанах, Бешанковіцкі палацава-паркавы ансамбль XVIII–XIX стст., Полацкі езуіцкі калегіум сярэдзіны XVIII ст., дом Тызенгаўза другой паловы XVIII ст. у Гродне, палац Храптовічаў у Шчорсах другой паловы XVIII ст., Шклоўская ратуша другой паловы XVIII ст., Бабруйская крэпасць першай паловы XIX ст., Косаўскі палац першай паловы XIX ст. і будынак гімназіі першай паловы XIX ст. у Свіслачы[23].

Тыя помнікі, якія не трапілі ў катэгорыю «празмерных» і павінны былі захавацца ў культурным ландшафце Беларусі, таксама знаходзіліся не ў лепшым стане. Наведаўшы ў 1964 г. гомельскі палац Румянцавых – Паскевічаў, што фармальна ахоўваўся дзяржавай, мастацтвазнаўца А. А. Сурскі апісаў стан палаца наступнымі словамі: «Брудная лесвіца, заляпаныя сцены, столь, з якой сыплецца атынкоўка, перакошаныя рамы з жалезнымі кратамі і вышчарбленая падлога даўно чакаюць цесляроў і маляроў»[24]. Мастак С. Акуліч звярнуў увагу грамадскасці на капліцу з магільным склепам рода Паскевічаў, якая, як і палац, знаходзілася пад аховай дзяржавы, але тым не менш паволі разбуралася і гінула[25].

У БССР за час правядзення антырэлігійнай кампаніі ў канцы 1950-х – першай палове 1960-х гг. вялікая колькасць будынкаў храмаў, сінагог, мячэцей былі зруйнаваны. Некаторыя з іх – Дабравешчанская царква ў Віцебску, Фара Вітаўта ў Гродне, касцёл Св. Стэфана ў Полацку, Свята-Пакроўская царква ў Магілёве і інш. – з’яўляліся каштоўнымі помнікамі архітэктуры. У гэтых умовах неабыякавыя грамадзяне спрабавалі ўратаваць старажытныя храмы, легітымізуючы іх існаванне ў вачах улады з дапамогай разнастайнай аргументацыі. Так, выкладчык Наваградскага вучылішча механізацыі сельскай гаспадаркі З. Зінгер заклікаў стварыць у зачыненым у 1948 г. мясцовым фарным касцёле краязнаўчы музей. Сваю прапанову ён тлумачыў тым, што пры гэтым касцёле існавала школа, дзе вучыўся А. Міцкевіч[26]. На аснове матэрыялу, знятага кінааматарам П. Захаранкам падчас летняга экспедыцыйнага сезона Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ў 1961 г. у Брэсцкай і Гродненскай абласцях[27], быў зроблены фільм «Помнікі даўніны»[28].

У адрозненне ад архітэктурнай, археалагічная спадчына Беларусі не стала ахвярай ідэалагічных кампаній. Тым не менш помнікі археалогіі паступова знікалі ў выніку гаспадарча-будаўнічай дзейнасці, а таксама незаконных раскопак, спыніць якія ў археолагаў на месцах не заўсёды атрымлівалася[29]. Гэту праблему ў публічны дыскурс змясціў навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР Л. Д. Побаль, які па вяртанні з міжнароднай нарады па славянскай археалогіі, якая адбылася ў Будапешце, пісаў: «У некаторых месцах археалагічныя помнікі не ахоўваюцца, не ўзяты на ўлік, а іншы раз нават цяжка ўстанавіць, хто ж канкрэтна адказвае за іх ахову. На тэрыторыі многіх калгасаў, па распараджэнню старшынь сельгасарцеляў, знішчаюцца курганныя насыпы – археалагічныя помнікі эпохі Кіеўскай Русі IX–XIII стст. Часта разбураюцца і гарадзішчы – рэшткі старажытных гарадоў… Узнікла неабходнасць ва ўсіх старарускіх гарадах, такіх як Полацк, Мінск, Віцебск, Тураў, Ваўкавыск, Слонім і іншыя, не рабіць ніякіх земляных работ у раннефеадальных дзядзінцах-крамлях без папярэдняга даследавання і раскопак участка, які плануецца пад тую ці іншую забудову»[30].

Артыкул Л. Д. Побаля з’явіўся ў 1964 г. Гэты год ЮНЭСКА абвясціла годам аховы помнікаў культуры чалавецтва, тады ж была ратыфікавана Міжнародная хартыя захавання і рэстаўрацыі помнікаў і мясцін (Венецыянская хартыя). Арганізаваўшы шэраг мерапрыемстваў па папулярызацыі спадчыны, да міжнароднай кампаніі далучылася кіраўніцтва СССР. Усё часцей праблемы аховы помнікаў пачалі асвятляцца на старонках перыядычнага друку. Так, у прысвечанай году аховы помнікаў публікацыі

[22]НАРБ. Ф. 952. Воп. 3. Спр. 25. Арк. 104.
[23]Там жа. Арк. 101, 105.
[24]*Сурскі А.* Тайны Гомельскага музея // Літ. і мастацтва. 1964. 19 чэрв. (№ 49). С. 2.
[25]*Акуліч С.* Перапіска расце, а помнікі гінуць // Там жа. 1963. 4 студз. (№ 2). С. 3.
[26]*Зінгер З.* Захаваць помнік, стварыць музей // Там жа. 1961. 10 студз. (№ 3). С. 3.
[27]Научная экспедиция искусствоведов // Сов. Белоруссия. 1961. 20 сент. (№ 223). С. 4.
[28]Кинофильмы любителя // Там же. 9 дек. (№ 286). С. 4.
[29]*Тарасенко В.* Если любишь старину // Знамя юности. 1964. 26 нояб. (№ 234). С. 3.
[30]*Побаль Л.* Берагчы помнікі культуры // Літ. і мастацтва. 1964. 10 студз. (№ 3). С. 4.

І. Б. Элентуха быў дадзены рэтраспектыўны агляд савецкай дзяржаўнай палітыкі ў галіне аховы помнікаў, узняты вострыя пытанні захавання беларускай архітэктурнай спадчыны, такія як удзел грамадскасці ў яе ахове, а таксама знішчэнне храмаў падчас хрушчоўскай антырэлігійнай кампаніі[31].

«Адліга» легалізавала дзейнасць беларускіх калекцыянераў, многія з якіх актыўна ўдзельнічалі ў захаванні аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны. У 1959 г. у Мінску адбылося адкрыццё клуба калекцыянераў, што аб'яднаў звыш 100 філатэлістаў, баністаў, нумізматаў, філуменістаў і філакартыстаў. Найбольш аўтарытэтныя з іх, стаж якіх вылічаўся дзясяткамі гадоў, увайшлі ў праўленне клуба (напрыклад, вядомы біёлаг акадэмік М. П. Томін)[32]. Адначасова з актывізацыяй збіральніцкай дзейнасці беларускія калекцыянеры вярнуліся да ідэі публічнага выкарыстання сабранага. У першую чаргу гэта праявілася ў арганізацыі выстаў з прыватных калекцый. Прынцыпова важны крок у гэтым кірунку быў зроблены ў 1964 г., калі на гістарычным факультэце БДУ імя Леніна на падмурку калекцыі вядомага вучонага-нумізмата В. Н. Рабцэвіча быў адкрыты нумізматычны кабінет, які адлюстроўваў грашовы зварот у Беларусі[33].

У 1961 г. фондавы збор Дзяржаўнага мастацкага музея БССР узбагаціўся карцінамі заходнееўрапейскага класічнага жывапісу XVII–XIX стст. з прыватнай калекцыі прафесара М. Ф. Габышава[34]. Сталым ахвярадаўцам Віцебскага абласнога краязнаўчага музея з'яўляўся мясцовы калекцыянер І. Д. Галькевіч[35]. Таксама з музеямі актыўна супрацоўнічаў уладальнік вялікай калекцыі матэрыяльнай культуры беларусаў М. В. Магільны[36]. Найбольш плённа з калекцыянерамі ўзаемадзейнічаў Дзяржаўны мастацкі музей БССР. Французская мастачка беларускага паходжання Н. Н. Хадасевіч-Лежэ, якая была знаёма з дырэктарам названага музея А. В. Аладавай, перадала ў дар музею некалькі дзясяткаў распісаных Пікасо талерак, калекцыю з больш за 150 вырабленых у Луўры класічных злепкаў, падборку эстампаў Ф. Лежэ, а таксама ўласныя супрэматычныя кампазіцыі[37].

Станаўленне грамадскага руху па захаванні помнікаў айчыннай культуры актуалізавала пытанне адраджэння краязнаўчага руху 1920-х гг. Адным з першых пра дасягненні беларускіх краязнаўцаў часоў беларусізацыі, у тым ліку ў помнікаахоўнай галіне, згадаў супрацоўнік лагойскай раённай газеты Б. Сасноўскі. На яго думку, базай адраджэння арганізацыйнай структуры краязнаўчага руху ў выглядзе сеткі рэгіянальных арганізацый павінны былі стаць АН БССР і Таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў[38]. Неўзабаве група беларускай інтэлігенцыі выступіла з прапановай адрадзіць краязнаўчы часопіс «Наш край»[39].

Новай вехай у культурным жыцці Савецкай Беларусі, дзе сфера аховы помнікаў манапольна кіравалася дзяржавай, стала арганізацыя беларускага таварыства, дзейнасцю якога была ахова помнікаў гісторыі і культуры. Праца па ўзнікненні гэтай грамадскай арганізацыі распачалася пасля выхаду пастановы ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР ад 19 чэрвеня 1965 г. «Аб стварэнні Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры»[40]. На працягу наступных паўтара гадоў прайшлі абласныя ўстаноўчыя канферэнцыі Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, было створана больш за тысячу першасных арганізацый, куды ўступалі цэлымі калектывамі школ, тэхнікумаў, музеяў. У выніку да канца 1966 г. у яго складзе налічвалася каля 80 000 сябраў, дзейнасць якіх шырока асвятлялася ў мясцовых СМІ[41]. У 1965 г. у газеце «Літаратура і мастацтва» з'явілася сталая рубрыка «Помнікі нашага краю». У 1966 г. па сцэнарыю У. Караткевіча на Мінскай студыі хранікальна-дакументальных фільмаў рэжысёр Ю. Цвяткоў зняў стужку «Памяць каменя», дзе выразна прагучаў заклік абараняць помнікі культавага дойлідства. Разам з захапленнем прыгажосцю і багаццем айчыннай культурнай спадчыны да беларускай інтэлігенцыі прыйшло разуменне страт, якія яна пацярпела падчас хрушчоўскай антырэлігійнай кампаніі і эксперыментаў з аптымізацыяй выдаткаў на сферу культуры[42].

Актывісты Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры распачалі інвентарызацыю нерухомай культурнай спадчыны рэспублікі. У 1965 г. на ўлік былі ўзяты 2587 пом-

[31] *Элентух І.* Ведаць і ахоўваць помнікі мінулага // Літ. і мастацтва. 18 верас. (№ 75). С. 2.
[32] Клуб коллекционеров // Сов. Белоруссия. 1959. 19 авг. (№ 194). С. 4.
[33] *Фірштэйн Б.* Маўклівыя сведкі расказваюць // Літ. і мастацтва. 1966. 7 студз. (№ 3). С. 2.
[34] *Морозов М.* Судьба ценной коллекции // Сов. Белоруссия. 1961. 10 февр. (№ 35). С. 4.
[35] Редкая коллекция // Знамя юности. 1957. 20 окт. (№ 208). С. 2.
[36] *Зиновьев А.* Человек-музей // СБ. Беларусь сегодня. 2009. 8 сент. (№ 168). С. 13.
[37] Хораша на зямлі бацькоў // Літ. і мастацтва. 1967. 18 крас. (№ 31). С. 4.
[38] *Сасноўскі Б.* Аднавіць работу краязнаўчых таварystваў // Там жа. 1960. 5 жн. (№ 63). С. 2.
[39] *Азгур З., Гурскі І., Клышка А., Лынькоў М., Лужанін М., Маўр Я. і інш.* Патрэбен краязнаўчы часопіс // Там жа. 1966. 9 мая (№ 38). С. 3.
[40] НАРБ. Ф. 4. Воп. 81. Спр. 1956. Арк. 17.
[41] Беларус. дзярж. арх. навук.-тэхн. дак. (БДАНТД). Ф. 297. Воп. 1. Спр. 2. Арк. 35.
[42] *Чантурыя У.* Помнікі гісторыі і жывое жыццё… С. 1–2 ; *Шут К.* Помнікам старажытнасці – надзейную ахову // Чырв. змена. 1966. 5 чэрв. (№ 109). С. 3.

нікаў, праведзены кансервацыйныя работы на 19 аб'ектах, рабіліся захады па вызваленні помнікаў ад займаўшых іх гаспадарчых арганізацый. Гэта праца праводзілася з арганізацыйнай падтрымкай партыйных і савецкіх органаў[43]. Нарэшце ўлада пачула дырэктара Крычаўскага краязнаўчага музея М. Ф. Мельнікава, які раней безвынікова звяртаўся ў вышэйшыя інстанцыі з патрабаваннямі абараніць культурную спадчыну і пакараць вінаватых у яе знішчэнні. У снежні 1965 г. яго допіс пра склад селядцоў у Мсціслаўскім касцёле XVII ст.[44] выклікаў імгненную рэакцыю загадчыка аддзела агітацыі і прапаганды Магілёўскага абкама партыі, які пачаў «наводзіць парадак» у культавым будынку[45]. Разам з тым узаемадзеянне энтузіястаў аховы спадчыны з партыйнымі функцыянерамі мела ідэалагічныя межы, якія не варта было перакрочваць. Папрок А. А. Сурскага ў адносінах да Магілёўскага абласнога аддзялення Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, якое брала на ўлік пераважна помнікі рэвалюцыйнай і баявой славы, часта ігнаруючы сапраўдныя культурныя каштоўнасці, не быў прыняты да ўвагі[46].

У Мінску 7 снежня 1966 г. адбыўся ўстаноўчы сход Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, дзе з праграмным дакладам выступіў старшыня аргкамітэта, акадэмік-сакратар Аддзялення грамадскіх навук АН БССР Ц. С. Гарбуноў. Ён распявёў пра ўдзел савецкай дэлегацыі ў стварэнні ў 1965 г. Міжнароднай рады па пытаннях помнікаў і гістарычных мясцін (ІКАМОС), мерапрыемствы беларускіх цэнтральных і мясцовых улад па абароне культурнай спадчыны, яе важнасць для развіцця турызму. З яго даклада можна было таксама даведацца пра канкрэтныя захады па ахове помнікаў, зробленыя пасля з'яўлення пастановы ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР ад 19 чэрвеня 1965 г., а менавіта пра вывядзенне з Полацкага Сафійскага сабора кніжнага складу, з Сынкавіцкай і Маламажэйкаўскай цэркваў – калгасных складоў, з замка Сапегаў у Быхаве – майстэрняў райпрамкамбіната і інш. Былі таксама агучаны планы аднавіць Мінскае замчышча, адкрыць філіял Дзяржаўнага музея БССР у Заслаўі і стварыць навукова-рэстаўрацыйныя майстэрні[47]. У спрэчках па дакладу Ц. С. Гарбунова ўдзельнічалі Л. С. Абэцэдарскі (запатрабаваў узмацніць адказнасць за псаванне культурнай спадчыны), У. А. Чантурыя (прапанаваў стварыць беларускі скансэн) і У. І. Стальмашонак (выступіў супраць зносу Нямігі)[48]. Напрыканцы сходу быў прыняты статут Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, галоўнай мэтай дзейнасці якога з'яўлялася «прыцягненне шырокай грамадскасці да актыўнага ўдзелу ў ахове помнікаў гісторыі і культуры, павышэнне іх ролі ў камуністычным выхаванні савецкіх людзей». Быў абраны цэнтральны савет Беларускага дабраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры на чале з намеснікам старшыні Савета Міністраў БССР І. Ф. Клімавым[49].

Стварэнне Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры адкрыла якасна новую старонку ў гісторыі захавання нацыянальнай культурнай спадчыны. Яго сябры распачалі ратаваць ад разбурэння дзясяткі помнікаў, не далі напоўніцу рэалізавацца хрушчоўскай «архітэктурнай рэвалюцыі». Разам з тым намаганні энтузіястаў-аматараў прадэманстравалі арганізацыйную і рэсурсную слабасць дзяржаўнай сістэмы аховы помнікаў. Напрыклад, у 1965 г. на аднаўленне помнікаў дойлідства з рэспубліканскага бюджэта было выдзелена ўсяго 5000 руб.[50]

Згодна з пастановай ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР ад 19 верасня 1967 г. у Міністэрстве культуры БССР быў створаны новы орган – Дзяржаўная інспекцыя па ахове помнікаў гісторыі, мастацтва, архітэктуры і археалогіі, на якую ўскладалася кіраўніцтва і каардынацыя ўсёй помнікаахоўнай дзейнасці ў рэспубліцы. Адпаведна дадзенай пастанове гісторыка-археалагічнымі запаведнікамі абвяшчаліся Верхні і Ніжні замкі ў Полацку ў комплексе з Сафійскім саборам, Замкавая гара ў Гродне з усімі архітэктурнымі і гістарычнымі помнікамі, Замкавая гара і могільнік у Пінску, старажытнае гарадзішча ў комплексе з Спаса-Праабражэнскай царквой і магілай Рагнеды ў Заслаўі Мінскай вобласці. Акрамя таго, вакол найбольш каштоўных помнікаў і гістарычных забудоў у гарадах усталёўваліся ахоўныя зоны. Партыйныя савецкія органы павінны былі забяспечыць рэстаўрацыю помнікаў, якія размяшчаліся на турыстычных маршрутах, і іх рацыянальнае выкарыстанне ў якасці музеяў, бібліятэк, дамоў адпачынку, турбаз[51].

[43]БДАНТД. Ф. 297. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 11–21.
[44]*Мельнікаў М.* Нельга быць раўнадушным // Літ. і мастацтва. 1965. 28 верас. (№ 78). С. 3.
[45]Пад аховай грамадскасці // Там жа. 14 снеж. (№ 100). С. 2.
[46]*Сурскі А.* Колькі гадоў Магілёву? // Там жа. 1966. 24 мая (№ 42). С. 2.
[47]Ведаць, шанаваць, берагчы. Устаноўчы з'езд Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры // Літ. і мастацтва. 1966. 13 снеж. (№ 100). С. 1–2.
[48]БДАНТД. Ф. 297. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 1–2.
[49]Там жа. Арк. 25–65.
[50]Там жа. Арк. 22.
[51]Аб стане і мерах паляпшэння аховы помнікаў гісторыі, мастацтва і архітэктуры ў Беларускай ССР // Зб. законаў, указаў Прэзідыума Вярх. Савета Беларус. ССР, пастаноў і распараджэнняў Савета Міністраў Беларус. ССР. 1967. № 28. С. 565–568.

Намаганні дзяржавы і грамадства па ахове нацыянальнай культурнай спадчыны ў 1953–1968 гг. падсумаваў прыняты 26 снежня 1969 г. Вярхоўным Саветам БССР закон, адпаведна якому можна рэгуляваць увесь спектр праваадносін у помнікаахоўнай сферы[52].

Такім чынам, у часы хрушчоўскай «адлігі» ў БССР адбылася змена характару аховы і выкарыстання культурнай спадчыны, калі да галіновых помнікаахоўных дзяржаўных структур далучыўся грамадскі рух па выяўленні і выратаванні помнікаў гісторыі і культуры. Гэта быў супярэчлівы працэс, які суправаджаўся масавым знішчэннем культавых будынкаў падчас антырэлігійнай кампаніі канца 1950-х – першай паловы 1960-х гг., а таксама скарачэннем дзяржаўнага фінансавання музеяў і аховы помнікаў. Тым не менш менавіта ў гэты час адбылося каштоўнаснае пераасэнсаванне помнікаў, якія ўсё часцей разумеліся як мастацкая з'ява, а іх рэлігійны і класавы складнікі адсоўваліся на задні план. Калі на пачатку разглядаемага перыяду «адлігі» помнікамі архітэктуры Беларусі апекаваліся асобныя чыноўнікі і вучоныя паводле ўласных службовых заняткаў, то напрыканцы гэтага 15-годдзя да справы выратавання культурнай спадчыны далучыліся пісьменнікі, мастакі, журналісты, настаўнікі і навучэнцы. Нягледзячы на тое што пасля стварэння ў 1966 г. Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры грамадскі помнікаахоўны рух арганізацыйна і ідэалагічна быў пастаўлены пад партыйны кантроль, ён аб'ектыўна спрыяў змяшчэнню спадчыны ў нацыянальны дыскурс.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Кацер МС. *Белорусская архитектура. Исторический очерк*. Минск: Государственное издательство БССР; 1956. 120 с.
2. Загорульский ЭМ. *Древний Минск*. Минск: Государственное издательство БССР; 1963. 117 с.
3. Элентух И, составитель. *По дорогам времени. Фотоальбом*. Минск: Беларусь; 1966. 71 с. (Исторические памятники Белоруссии).
4. Чантурия ВА. *Архитектура Белоруссии конца XVIII – начала XIX века*. Минск: Издательство Министерства высшего, среднего специального и профессионального образования БССР; 1962. 167 с.

## References

1. Katser MS. *Belorusskaya arkhitektura. Istoricheskii ocherk* [Belarusian architechture. Historical study]. Minsk: Gosudarstvennoe izdatel'stvo BSSR; 1956. 120 p. Russian.
2. Zagorul'skii EM. *Drevnii Minsk* [Old Minsk]. Minsk: Gosudarstvennoe izdatel'stvo BSSR; 1963. 117 p. Russian.
3. Elentukh I, compiler. *Po dorogam vremeni. Fotoal'bom* [On the roads of time. Photoalbum]. Minsk: Belarus'; 1966. 71 p. (Istoricheskie pamyatniki Belorussii). Russian.
4. Chanturia VA. *Arhitektura Belorussii konca XVIII – nachala XIX veka* [Architechture of Belarus. End of the 18th – the beginning of the 19th century]. Minsk: Izdatel'stvo Ministerstva vysshego, srednego, spetsyal'nogo i professional'nogo obrazovania BSSR; 1962. 167 p. Russian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 11.06.2021.*
*Received by editorial board 11.06.2021.*

[52]Аб ахове помнікаў культуры // Там жа. 1969. № 36. С. 857–862.

# Источниковедение
# Крыніцазнаўства
# Source studies

УДК [39:006.95-035.31/.32+398.33](=161.3)(476.1-89)

# ТРАДИЦИОННЫЙ БЕЛОРУССКИЙ ДЕРЕВЯННЫЙ КАЛЕНДАРЬ ИЗ СЛУЦКОГО УЕЗДА

***И. С. БУТОВ***[1]***, Д. В. СКВОРЧЕВСКИЙ***[2]

[1]*Независимый исследователь, г. Минск, Беларусь*
[2]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Отмечено, что резные деревянные календари использовались многими народами с эпохи Средневековья до начала XX в. И если скандинавские достаточно хорошо изучены, то о существовании у белорусов подобных календарей долгое время не было известно. В Российском этнографическом музее хранится резной деревянный календарь-посох из д. Чудин Слуцкого уезда. На сегодняшний день это единственный такой белорусский артефакт. Представлено его описание, а также дан краткий обзор других календарей схожего типа и показаны предпосылки для формирования и распространения подобных артефактов на территории Беларуси. Отдельно рассмотрена знаковая система, используемая для обозначения праздничных дней и периодов сельскохозяйственных работ, которые соотносятся с календарной традицией региона. На основании полученных данных сделаны выводы о местном происхождении календаря-посоха.

***Ключевые слова:*** резной деревянный календарь; народный календарь; праздники; знаковая система.

***Благодарность.*** Авторы выражают благодарность доктору исторических наук заместителю директора по научной и инновационной работе Центра исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси С. П. Витязю за помощь в организации командировки для исследования календаря в Российском этнографическом музее,

**Образец цитирования:**
Бутаў ІС, Скварчэўскі ДВ. Традыцыйны беларускі драўляны каляндар са Слуцкага павета.*Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2021;3:97–110.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2021-3-97-110

**For citation:**
Butov IS, Skvarcheuski DV. Traditional Belarusian wooden calendar from Sluck County. *Journal of the Belarusian State University. History.* 2021;3:97–110. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2021-3-97-110

**Авторы:**
***Илья Станиславович Бутов*** – кандидат сельскохозяйственных наук; независимый исследователь.
***Дмитрий Вячеславович Скворчевский*** – кандидат исторических наук; доцент кафедры истории Беларуси древнего времени и средних веков исторического факультета.

**Authors:**
***Ilya S. Butov***, PhD (agricultural science); independent researcher.
*illiabutov@gmail.com*
*https://orcid.org/0000-0003-3187-3552*
***Dzmitry V. Skvarcheuski***, PhD (history); associate professor at the department of Belarus history of the ancient time and the Middle Ages, faculty of history.
*skvarcheuski@inbox.ru*
*https://orcid.org/0000-0001-6855-0867*

а также научному сотруднику высшей категории отдела этнографии русского народа Российского этнографического музея О. Г. Барановой за возможность ознакомиться с экспонатом и оказанные консультации.

# ТРАДЫЦЫЙНЫ БЕЛАРУСКІ ДРАЎЛЯНЫ КАЛЯНДАР СА СЛУЦКАГА ПАВЕТА

***І. С. БУТАЎ*[1*], *Д. В. СКВАРЧЭЎСКІ*[2*]**

[1*]*Незалежны даследчык, г. Мінск, Беларусь*
[2*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Адзначана, што разьбяныя драўляныя календары выкарыстоўваліся многімі народамі з эпохі Сярэднявякоўя да пачатку XX ст. І калі скандынаўскія даволі добра вывучаны, то пра існаванне ў беларусаў падобных календароў доўгі час не было вядома. У Расійскім этнаграфічным музеі захоўваецца разьбяны драўляны каляндар-посах з в. Чудзін Слуцкага павета. На сённяшні дзень гэта адзіны такі беларускі артэфакт. Прадстаўлена яго апісанне, а таксама зроблены кароткі агляд іншых календароў сходнага тыпу і паказаны перадумовы для фарміравання і пашырэння падобных артэфактаў на тэрыторыі Беларусі. Асобна разгледжана знакавая сістэма, якая выкарыстоўваецца для пазначэння святочных дзён і перыядаў сельскагаспадарчых работ, што суадносяцца з каляндарнай традыцыяй рэгіёна. На падставе атрыманых звестак зроблены высновы пра мясцовае паходжанне календара-посаха.

***Ключавыя словы:*** разьбяны драўляны каляндар; народны каляндар; святы; знакавая сістэма.

***Падзяка.*** Аўтары выказваюць падзяку доктару гістарычных навук намесніку дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі С. П. Віцязю за дапамогу ў арганізацыі камандзіроўкі для даследавання календара ў Расійскім этнаграфічным музеі, а таксама навуковаму супрацоўніку вышэйшай катэгорыі аддзела этнаграфіі рускага народа Расійскага этнаграфічнага музея В. Г. Баранавай за магчымасць азнаёміцца з экспанатам і аказаныя кансультацыі.

# TRADITIONAL BELARUSIAN WOODEN CALENDAR FROM SLUCK COUNTY

***I. S. BUTOV*[a], *D. V. SKVARCHEUSKI*[b]**

[a]*Independent researcher, Minsk, Belarus*
[b]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

*Corresponding author: D. V. Skvarcheuski (skvarcheuski@inbox.ru)*

Carved wooden calendars were known to many peoples from the Middle Ages to the beginning of the 20$^{th}$ century. For example, the Scandinavian ones are well enough studied, but about the existence of such calendars among Belarusians wasn’t known for a long time. The Russian Museum of Ethnography has a carved calendar from the Sluck County. Today it is the only such Belarusian artifact. The article presents a description of a carved wooden calendar from the Čudzin Village, Sluck County. A brief overview of other calendars of a similar type is shown. The prerequisites for the formation and distribution of such artifacts on the territory of Belarus were studied. The article discusses the sign system used to designate holidays and working periods, which correlate with the calendar tradition of the region. Based on the data obtained, the authors draw conclusion about the local origin of the calendar.

***Keywords:*** carved wooden calendar; folk calendar; feast days; graphic sign system.

***Acknowledgements.*** The authors are grateful to doctor of science (history) deputy director for scientific and innovative work of the Center for the Belarusian Culture, Language and Literature Researches of the National Academy of Sciences of Belarus S. P. Vitsiaz for his help in organising a visit to study the calendar at the Russian Museum of Ethnography and to researcher of the highest category at the department of ethnography of Russian people of the Russian Museum of Ethnography O. G. Baranova for providing the opportunity to explore the artifact and for the consultations.

## Уводзіны

Разьбяныя драўляныя календары, якія маюць выгляд бруска ці кія з нанесенымі на іх засечкамі і адмысловымі знакамі, вядомы на тэрыторыі краін Скандынавіі (мал. 1) [1], Прыбалтыкі [2], Рускай Поўначы [3; 4], Балгарыі [5] і ў іншых рэгіёнах. Звычайна назвы месяцаў на паверхні такіх календароў не падпісаны, а адмысловай сістэмай засечак пазначаны дні, тыдні, месяцы і нерухомыя царкоўныя святы [6; 7, с. 3].

У той жа час практычна нічога невядома пра беларускія драўляныя календары. Пра іх выкарыстанне на тэрыторыі Рэчыцкага Палесся ў канцы XIX – пачатку XX ст. згадваў этнограф Ч. Пяткевіч. Ён адзначаў, што на Палессі на кляновых кіях насякалі шчаслівыя дні, а таксама выраблялі кіі з ляшчыны, на якіх выразалі працоўныя дні [8, с. 278–279]. Гэта ўжо не былі календары ў поўным сэнсе слова, аднак дадзеныя факты сведчаць пра імавернасць існавання ў сялянскім асяроддзі разьбяных драўляных календароў. Таксама ў літаратуры ёсць згадкі пра так званы карэц-брацiну (выяўлены ў Гродне, але да гэтага, магчыма, экспанаваўся ў музеі Магілёва) з меркаванымі выявамі знакаў задыяка альбо сімвалічнымі выявамі месяцаў. Па розных ацэнках, ён датуецца IX–XII ці нават XVI ст. [9, с. 363–365; 10; 11]. Гэтым фактычна і абмяжоўваюцца вядомыя звесткі пра існаванне драўляных календароў на тэрыторыі Беларусі.

Асобна трэба сказаць пра табакерку-каляндар з калекцыі Віцебскага абласнога краязнаўчага музея (мал. 2), якая была выраблена ў Швецыі ў 1812 г. Асаблівасць падобных табакерак-календароў заключаецца ў тым, што яны генетычна звязаны са скандынаўскімі рунічнымі календарамі XVI–XVII стст. Дадзеная сувязь выразна прасочваецца ў аднолькавай структуры (пазначэнні дзён, свят, месячнага цыкла) і ў выкарыстанні адных і тых жа адмысловых сімвалаў для пазначэння святочных дзён. Акрамя таго, як можна ўбачыць на прадмеце з калекцыі музея ў Віцебску, табакерка ўспрымалася як рунічны каляндар, пра што сведчыць наяўнасць адпаведнага тэрміна (*Runstav*) у надпісе на табакерцы: *Runstafwen Forswenskad*. Першая падобная табакерка-каляндар была зроблена ў Швецыі ў 1787 г., а наступныя вырабы выпускаліся ў 1794, 1802, 1812 і 1827 гг. На верхняй крышцы табакеркі змяшчаецца каляндар на першае паўгоддзе (студзень – чэрвень), а на адваротным баку – на другое (ліпень – снежань). Злева падпісаны назвы месяцаў, а сам каляндар арганізаваны ў тры радкі. Сярэдні радок з'яўляецца асноўным і ўтрымлівае паўторны шэраг літар A, B, C, D, E, F, G, якія пазначаюць дні тыдня, у колькасці ад 28 да 31 у залежнасці ад месяца. У верхнім радку размяшчаюцца ўмоўныя знакі для святочных дзён, а ў ніжнім – літары і кропкі, якія выкарыстоўваюцца для пазначэння месячнага календара [12, с. 83–84].



*Мал. 1.* Рунічныя драўляныя календары на гравюры О. Магнуса з кнігі «Historia de gentibus septentrionalibus» (1555)

*Fig. 1.* Runic wooden calendars engraved by O. Magnus from the book «Historia de gentibus septentrionalibus» (1555)




*Мал. 2.* Адзін з бакоў табакеркі-календара з калекцыі Віцебскага абласнога краязнаўчага музея (фота В. Ануфрыевай)

*Fig. 2.* One of the sides of the snuffbox-calendar from the collection of the Vitebsk Regional Museum of Local Lore (photo by O. Anufrieva)

Дадзены артэфакт, безумоўна, не можа характарызаваць традыцыйны беларускі каляндар. Аднак можна дапусціць магчымасць пэўнага ўплыву падобных вырабаў на стварэнне сялянамі ўласных календароў праз капіраванне структуры і асобных элементаў і іх перапрацоўку з улікам мясцовай спецыфікі. Падобным чынам скандынаўскія рунічныя календары былі адаптаваны ў XVII ст. да каляндарных традыцый Літвы [2, с. 339–343].

Нягледзячы на абмежаванасць звестак пра беларускія драўляныя календары, ёсць адзін артэфакт, пра які доўгі час не было вядома. Яшчэ на пачатку XX ст. знакаміты этнограф А. Сержпутоўскі выявіў на тэрыторыі Слуцкага павета драўляны кій з засечкамі, тыпалагічна блізкі да паўночных календароў, і перадаў яго ў Расійскі этнаграфічны музей (РЭМ). Калі не лічыць кароткай згадкі пра існаванне дадзенага экспаната ў дысертацыі Д. Скварчэўскага[1] ў 2016 г., у навуковы абарот інфармацыя пра яго была ўведзена толькі ў 2020 г. В. Баранавай і В. Сядых на канферэнцыі «Экспедыцыя працягласцю ў жыццё. Актуальныя пытанні археалогіі і нумізматыкі Беларусі і сумежных рэгіёнаў», прысвечанай памяці археолага А. Плавінскага. У выніковай публікацыі дэталёва апісаны каляндар[2], патлумачаны яго структура і прынцып выкарыстання, зроблена спроба атрыбуцыі экспаната, аднак фактычна не закрануты пытанні, што датычацца гісторыка-культурных аспектаў выкарыстання артэфакта [13]. Адпаведна, мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца інтэрпрэтацыя календара з калекцыі РЭМ у кантэксце іншых вядомых разьбяных календароў, а таксама беларускай традыцыйнай культуры і народнай каляндарнай традыцыі ў прыватнасці.

Першасны агляд і апісанне выкананы І. Бутавым непасрэдна падчас працы з артэфактам у РЭМ. Праверка атрыманых звестак і наступнае вывучэнне календара ажыццяўляліся па фотаздымках і прамалёўцы, зробленай Д. Собаль наўпрост з экспаната ў РЭМ.

## Асноўная частка

Драўляны каляндар са Слуцкага павета экспануецца ў РЭМ у раздзеле, прысвечаным Беларусі (мал. 3). Паводле запісу ў калекцыйным вопісе РЭМ № 3792, ён быў атрыманы ў падарунак ад А. Сержпутоўскага этнаграфічным аддзелам музея ў 1918 г., а да гэтага знаходзіўся ў в. Чудзін Круговіцкай воласці



*Мал. 3.* Каляндар са Слуцкага павета (у цэнтры) у экспазіцыі РЭМ (фота І. Бутава)
*Fig. 3.* Calendar from Sluck County (in centre) in the Russian Museum of Ethnography exposition (photo by I. Butov)

[1] *Скварчэўскі Д. В.* Фарміраванне і развіццё астранамічных ведаў у Вялікім Княстве Літоўскім у XIV–XVII стст. : дыс. … канд. гіст. навук. Мінск, 2016. С. 33.
[2] Варта звярнуць увагу на тэхнічную недакладнасць, якая прысутнічае ў дадзенай публікацыі. У прамалёўцы календара няма адзнак свят 8 і 14 верасня, хаця пры гэтым святы згадваюцца ў тэксце артыкула.

Слуцкага павета Мінскай губерні (зараз аграгарадок Чудзін Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці). У нататцы № 3792-9 да гэтага запісу адзначана, што каляндар «представляет собой четырехгранную деревянную трость (дл. 1,12 м), на которой сделаны нарезки на каждый день в течение високосного года с обозначением воскресных и праздничных дней и знаки: соха, коса, серп, цеп и подкова» [13, с. 705]. Хутчэй за ўсё, каляндар быў выразаны ў XIX ст., але з ранейшага ўзору.

Драўляны каляндарны кій са Слуцкага павета (мал. 4) падзелены вертыкальнымі лініямі на 26 частак. Кожная частка адпавядае тыдню. Такім чынам, адзін бок кія змяшчае паўгоддзе з сакавіка па жнівень, а другі – з верасня па люты. Зверху з аднаго боку ёсць засечкі, што пазначаюць дні. На грані, якая змяшчае месяцы з сакавіка па жнівень, лік дзён вядзецца злева направа, на грані, якая змяшчае месяцы з верасня па люты, – справа налева, пры гэтым каляндар трэба паварочваць ад сябе. Лік вядзецца па засечках, размешчаных на гранях з пазначэннем свят – першай і трэцяй. На другой і чацвёртай гранях засечкі згрупаваны па 7 (адпавядаюць тыдню) і па 30–31 (адпавядаюць месяцу), тыдні падзелены між сабой 52 простымі вертыкальнымі лініямі, што ідуць у процілеглы бок ад знака (адпавядаюць колькасці тыдняў у годзе). Вертыкальныя лініі, якія размяжоўваюць тыдні, размешчаны на нядзелях, а паміж месяцамі пакінуты прамежкі каля 1 см.

Выявы сельскагаспадарчых прылад можна суаднесці з адпаведным працоўным перыядам: саха – вясна, каса і серп – лета, падкова – восень, цэп – зіма. Першая выява, саха, знаходзіцца паміж 1 і 6 сакавіка (мал. 5, *а*). Паміж 27 чэрвеня і 4 ліпеня размешчаны знак касы (гл. мал. 5, *б*), паміж 25 ліпеня і 1 жніўня – сярпа (гл. мал. 5, *в*), паміж 27 кастрычніка і 3 лістапада – падковы (гл. мал. 5, *г*), а паміж 29 снежня і 5 студзеня – цэпа (мал. 6). Падобныя выявы сустракаюцца на пераважнай большасці вядомых драўляных календароў у краінах Паўночнай Еўропы, аднак трэба адзначыць, што звычайна іх значна больш, практычна кожнае свята можа атрымліваць сваё графічнае ўвасабленне. У гэтым плане беларускі каляндар досыць бедны на адмысловыя выявы, але ў дадатак да іх для пазначэння свят выкарыстана не ідэнтыфікаваная да канца сістэма знакаў на бакавых гранях (малыя і доўгія рыскі, касыя рыскі, знак, падобны на літару Т, знакі ў выглядзе лацінскай літары V і г. д.). Умоўна ўсе знакі можна падзяліць на асноўныя, якія служаць для вызначэння гадавых свят, і дадатковыя, якія маркіруюць перыяды галоўных штогадовых сельскагаспадарчых работ.



*Мал. 4.* Выявы на гранях календара (прамалёўка Д. Собаль)

*Fig. 4.* Images on the edges of the calendar (drawing by D. Sobal)




*Мал. 5.* Выявы на календары:
*а* – саха; *б* – каса; *в* – серп; *г* – падкова (фота І. Бутава)

*Fig. 5.* Images on the calendar:
*a* – plow; *b* – scythe; *c* – sickle; *d* – horseshoe (photo by I. Butov)



*Мал. 6.* Выява цэпа (фота І. Бутава)

*Fig. 6.* Image of a beater (photo by I. Butov)

На другой і чацвёртай бакавых гранях кія мы налічылі 365 засечак, што адпавядае колькасці дзён у звычайным, невысакосным, годзе. Аднак паколькі А. Сержпутоўскі пісаў пра «высакосны год», мабыць, ён меркаваў, што засечак усё ж 366. Невядома, абапіраўся вучоны на звесткі дарыльшчыка календара або падлічыў іх сам і спыніўся на такой лічбе. Як бы там ні было, пацвердзіць меркаванне А. Сержпутоўскага паўторным пералікам мы не змаглі. Акрамя таго, усе адзначаныя на календары святы з'яўляюцца нерухомымі, таму ён будзе актуальным і можа аднолькава выкарыстоўвацца і ў невысакосныя, і ў высакосныя гады. Па гэтай прычыне само пытанне пра дакладнасць звестак А. Сержпутоўскага не з'яўляецца прынцыповым і істотным для разумення календара. Улічваючы вышэйсказанае, а таксама наяўнасць адзнак менавіта для 365 дзён, аднясіць выраб дадзенага артэфакта да аднаго з высакосных гадоў XIX ст. (1824, 1852 ці 1880), як гэта зрабілі В. Баранава і В. Сядых [13, с. 705], з нашага пункта гледжання, некарэктна. З аднаго боку, можна дапусціць імавернасць вырабу календара ў нейкі высакосны год, хаця пры гэтым сам артэфакт будзе адлюстроўваць звычайны год. Аднак згаданая вышэй версія грунтуецца на тым, што і каляндар, і дата яго вырабу з'яўляюцца высакоснымі, але, як ужо было сказана, у разглядаемым артэфакце пазначаны 365 дзён, а гэта сведчыць пра адлюстраванне менавіта звычайнага года.

Новы год у найбольш пашыраных тыпах разьбяных календароў з іншых праваслаўных рэгіёнаў мог пачынацца ці з 1 сакавіка, ці з 1 верасня, што адпавядае архаічнай вясковай традыцыі [7, с. 3]. Як адзначаў В. Сразнеўскі, адлік года на разьбяных «усходніх праваслаўных» календарах па большай частцы вядзецца з 1 сакавіка [14, с. 72]. Пачатак года на гродненскім каляндарным каўшы таксама знаходзіцца ў сакавіку. На думку С. Віцязя, навагодняя дата адпавядае перыяду вясновага раўнадзенства [10, с. 92–93]. У вывучаемым намі календары год адлічваецца з сакавіка, на што ўказвае месцазнаходжанне месяца на пачатку грані з левага боку [13, с. 705].

Калі адлічваць год з 1 сакавіка, то ў календары са Слуцкага павета ў межах кожнага месяца вылучаюцца знакамі наступныя даты[3] (гл. табліцу).

**Святы і знакі для іх пазначэння на календары з в. Чудзін Слуцкага павета**

**Feast days and signs to mark them on the calendar from the Čudzin Village, Sluck County**

| Дзень | Царкоўнае свята | Народная назва | Умоўны знак |
|---|---|---|---|
| **Сакавік** (перыяд з 1 па 6 сакавіка пазначаны *сахой*) | | | |
| 1 | Прападобнай мучаніцы Еўдакіі | Аўдокі (Аўдакей) |  |
| 9 | Святых сарака мучанікаў Севасційскіх | Саракі |  |
| 25 | Благавешчанне Прасвятой Багародзіцы | Благавешчанне |  |
| **Красавік** | | | |
| 23 | Святога велікамучаніка Георгія Пераможцы | Юрэй (Юр'я) |  |
| **Май** | | | |
| 8 | Апостала і евангеліста Іаана Багаслова | Мікольны Іван (Іван Веснавы) |  |
| 9 | Перанясенне мошчаў свяціцеля і цудатворца Мікалая з Мір Лікійскіх у Бар | Мікола |  |

[3]Царкоўныя святы прадстаўлены з захаваннем традыцыйнага для рэлігійных тэкстаў напісання. Народныя назвы свят пададзены максімальна блізка да тых, якія існавалі ў першай палове XX ст. у Слуцкім павеце і Усходнім Палессі. Яны прыводзяцца паводле публікацый Ч. Пяткевіча [8], А. Сержпутоўскага [15], С. Талстой [16], К. Машыньскага [17].

Працяг табліцы
Continuation table

| Дзень | Царкоўнае свята | Народная назва | Умоўны знак |
|---|---|---|---|
| **Чэрвень** (перыяд з 27 чэрвеня па 4 ліпеня пазначаны *касой*) | | | |
| 24 | Нараджэнне слаўнага Прарока, Прадцечы і Хрысціцеля Гасподняга Іаана | Купало (Іван Купальны) |  |
| 29 | Слаўных і ўсяхвальных першавярхоўных апосталаў Пятра і Паўла | Пятро |  |
| **Ліпень** (перыяд з 25 ліпеня па 1 жніўня пазначаны *сярпом*) | | | |
| 20 | Прарока Іліі | Ілля |  |
| **Жнівень** | | | |
| 1 | Вынясенне пачэсных дрэў Жыватворнага Крыжа Гасподняга | Макавей |  |
| 6 | Праабражэнне Госпада Бога і Збавіцеля нашага Ісуса Хрыста | Іспас |  |
| 15 | Успенне Прасвятой Уладычыцы нашай Багародзіцы і Вечнадзевы Марыі | Усьпленне |  |
| 29 | Усекнавенне галавы Прарока, Прадцечы і Хрысціцеля Гасподняга Іаана | Галавасек |  |
| **Верасень** | | | |
| 8 | Нараджэнне Прасвятой Уладычыцы нашай Багародзіцы і Вечнадзевы Марыі | Багатнік |  |
| 14 | Уздзвіжанне Пачэснага і Жыватворнага Крыжа Гасподняга | Звіжанне |  |
| 26 | Спачын апостала і евангеліста Іаана Багаслова | Багаслоў |  |
| **Кастрычнік** (перыяд з 27 кастрычніка па 3 лістапада пазначаны *падковай*) | | | |
| 1 | Пакроў Прасвятой Уладычыцы нашай Багародзіцы і Вечнадзевы Марыі | Пакровы (ці Пакрава) |  |
| 8 | ? | ? |  |
| 22 | Казанскай іконы Божай Маці | Казанская |  |

Заканчэнне табліцы
Ending table

| Дзень | Царкоўнае свята | Народная назва | Умоўны знак |
|---|---|---|---|
| **Лістапад** | | | |
| 21 | Увядзенне ў храм Прасвятой Уладычыцы нашай Багародзіцы і Вечнадзевы Марыі | Зведзенне |  |
| **Снежань** (перыяд з 29 снежня па 5 студзеня пазначаны *цэпам*) | | | |
| 6 | Свяціцеля Мікалая, архіепіскапа Мір Лікійскіх, цудатворца | Мікола |  |
| 25 | Нараджэнне Госпада Бога і Збавіцеля нашага Іісуса Хрыста | Першая Каляда (Ражство) |  |
| **Студзень** | | | |
| 1 | Святога Васіля Вялікага | Другая Каляда (Васілье) |  |
| 6 | Святое Богаяўленне; Хрышчэнне Госпада Бога і Збавіцеля нашага Іісуса Хрыста | Трэйцяя Каляда (Вадохрышчэ) |  |
| **Люты** | | | |
| 2 | Стрэчанне Госпада Бога і Збавіцеля нашага Іісуса Хрыста | Грамніцы |  |

Заўвага. Знакам ? пазначана спрэчная інтэрпрэтацыя.

Як можна заўважыць, у разглядаемым календары адлюстраваны выключна нерухомыя святы, характэрныя для праваслаўнай царквы і вядомыя ў народнай традыцыі рэгіёна, з якога паходзіць артэфакт. Адзіная пазнака, што выклікае цяжкасці ў інтэрпрэтацыі, адносіцца да 8 кастрычніка. Паводле меркавання В. Баранавай і В. Сядых, яна адпавядае дню памяці святых Айцоў VII Сусветнага сабору [13, с. 707]. У той жа час варта звярнуць увагу, што гэта свята не прадстаўлена ў беларускім народным календары, таму яго прысутнасць выглядае малаімавернай з-за малой значнасці. Акрамя таго, нельга не звярнуць увагу на тое, што дзень памяці святых Айцоў VII Сусветнага сабору з'яўляецца рухомым і можа адзначацца не толькі 8 кастрычніка, але і ў іншыя даты. З улікам таго, што ў дадзеным артэфакце прадстаўлены толькі нерухомыя святы, то пазначэнне на ім гэтага царкоўнага свята лічым немагчымым.

У цэлым у беларускім народным календары 8 кастрычніка фактычна ніяк не адлюстравана. Ёсць адзіная згадка ў літаратуры, што ў гэты дзень адзначаецца прысвятак Трыфана і Пелагеі, які ўвасабляе надыход халоднай пары і патрэбу рыхтаваць зімовае адзенне: «Трыфан, Пелагея золкім ветрам вее», «Трыфан кажух латае, Палагея рукавічкі вяжа» [18, с. 158]. Між тым вядомасць дадзенага свята сярод беларусаў іншымі крыніцамі не пацвярджаецца. Апрача таго, гэта занадта дробны прысвятак, які вылучаецца сярод астатніх адлюстраваных у календары значных свят. Грунтуючыся на гэтым, мы

не бяромся сцвярджаць, што тут маецца на ўвазе менавіта прысвятак Трыфана і Пелагеі. Застаецца пад пытаннем, чаму ў календары адзначана 8 кастрычніка. Магчыма, гэта пазнака актуальнага для мясцовай супольнасці лакальнага фэсту, які ўзнік не на падставе царкоўнага свята, а ў выніку нейкага цудоўнага прэцэдэнту ці надзвычайнай сітуацыі. Наяўнасць дадзенай даты можна вылучыць у якасці адметнай асаблівасці разьбянога календара з в. Чудзін Слуцкага павета.

В. Баранава і В. Сядых адзначаюць спецыфіку святочнага шэрагу календара: у адрозненне ад большасці іншых на ім адсутнічаюць пазначэнні дзён шанавання мясцовых святых [13, с. 707]. Як пісаў пра разьбяныя календары М. Канстанцінаў, «при полном числе непереходящих двунадесятых и почти сходном списке великих праздников едва ли не в каждом деревянном экземпляре отмечены разные имена восточных и особенно русских святых» [6, с. 88]. Як бачна, вывучаемы каляндар з'яўляецца выключэннем. Відаць, тут варта шукаць мноства прычын. Выкажам некалькі здагадак, якія могуць патлумачыць дадзеную асаблівасць. Па-першае, на календары адлюстраваны найбольш значныя гадавыя святы, якія маюць важнае значэнне ў беларускай народнай культуры. Гэтыя святы спалучаюць дахрысціянскія і хрысціянскія звычаі, а таксама самі па сабе сталі грунтам для наступнай міфалагізацыі. Адзначаныя на календары святочныя даты з'яўляюцца маркерамі асноўных прыродных сезонаў і перыядаў сельскагаспадарчых работ. Дні шанавання мясцовых святых у гэтым плане з'яўляюцца другаснымі, яны прыходзяцца на даты, якія не іграюць значнай ролі ў сакральным і гаспадарчым гадавым цыкле мясцовага традыцыйнага грамадства, а таму не знайшлі адлюстравання ў вывучаемым разьбяным календары. Па-другое, на адсутнасць у ім дзён шанавання мясцовых святых таксама можа ўплываць рэгіянальны фактар: у пэўным населеным пункце і лакальнай супольнасці, у якой ствараўся каляндар, шанаванне гэтых святых не было характэрна.

Хоць сімвалы, што пазначаюць святы, і маюць стылістычнае падабенства са знакамі на іншых календарах, прамых супадзенняў і аналагаў, якія дазваляюць казаць пра запазычванні ці агульную традыцыю, не выяўлена. Гэта можа сведчыць пра існаванне ўласна распрацаванай арыгінальнай сістэмы пазначэння святочных дзён.

На жаль, не ўсе знакі, якія выкарыстоўваюцца для тых ці іншых свят, маюць зразумелую семантыку, але пэўныя заканамернасці можна выявіць. Доўгая прамая лінія пазначае дванадзясятыя гасподнія і багародзічныя святы праваслаўнай царквы, да якіх стваральнік календара таксама далучае святы Пакровы і Казанскай іконы Божай Маці, што адпавядае праваслаўнай традыцыі лічыць іх багародзічнымі. Аднак можа ўзнікнуць пытанне: «Чаму такі ж самы знак пазначае 1 студзеня?» Тут справа можа быць у асаблівасцях інтэрпрэтацыі свята Васіля Вялікага, якое злучаецца са святам Абразання. Апошняе свята, у сваю чаргу, з'яўляецца гасподнім (хоць і не дванадзясятым), а такія святы на календары пазначаюцца якраз доўгай прамой лініяй. Гэта сведчыць пра тое, што разьбяр ці даволі добра ведаў праваслаўны каляндар, ці карыстаўся нейкім правільным узорам.

Другая выразная група свят пазначаецца знакам у выглядзе лацінскай літары V. Гэта дні шанавання значных святых – Георгія Пераможцы, Мікалая, Пятра і Паўла, Іаана Хрысціцеля, Іаана Багаслова. Можна звярнуць увагу на даты 8 і 9 мая, якія хоць і прысвечаны Іаану Багаслову (кароткая нахіленая рыска) і святому Мікалаю (нахіленая літара V), але ў дадзеным выпадку маюць крыху адрознае пазначэнне, што паказвае на сувязь гэтых свят у народнай культуры: дзень Іаана Багаслова лічыўся ў народзе папярэднім святу Мікалая, таму нават зваўся Мікольны Іван, Бацька Міколы. Адметна, што наступныя дні шанавання гэтых святых, якія прыпадаюць на розныя няблізкія паміж сабой даты, на календары пазначаны ўжо стандартным знакам у выглядзе літары V.

Выключэннем з'яўляецца свята Нараджэння Іаана Хрысціцеля, пазначанае сімвалам, блізкім да тых, якія адносяцца да 1 і 9 сакавіка. Паводле царкоўнай традыцыі, яны не маюць прамой сувязі, за выключэннем таго, што прысвечаны святым, якія прынялі пакутніцкую смерць. У той жа час свята Усекнавенне галавы Іаана Хрысціцеля таксама пазначаецца стандартным знакам у выглядзе літары V.

Іншыя знакі ўжо не дэманструюць падобнай сістэмнасці. Зразумелым з'яўляецца выкарыстанне выявы крыжа, а не доўгай лініі для пазначэння Хрышчэння (6 студзеня). Заўважым яшчэ, што знак, якім пазначана 8 кастрычніка (неідэнтыфікаванае свята), амаль дакладна супадае са знакам, выкарыстаным для свята Макавей (1 жніўня). Імаверна, гэта можа быць сведчаннем наяўнасці нейкай сувязі паміж дзвюма датамі, але выяўлены аспект пакуль застаецца нераскрытым.

Таксама можна з асцярожнасцю патлумачыць знак, што нагадвае сякеру і пазначае дзень памяці святога Іллі (20 ліпеня). У іканаграфіі нярэдка святы Ілля адлюстраваны з мячом у руцэ, што звязана з сюжэтам пакарання жрацоў Ваала. Магчыма, сімвалічная выява сякеры ў дадзеным выпадку з'яўляецца народным пераасэнсаваннем выявы зброі святога. У якасці паралелі можна адзначыць, што на скандынаўскіх календарах таксама сустракаецца пазнака свята ў выглядзе сякеры. Яна адносіцца да дня памяці святога Олафа (29 ліпеня) [19, p. 317].

У сваю чаргу, сімволіка выяў сельскагаспадарчых прылад на календары вельмі празрыстая і зразуме-

лая. Такім чынам маркіруюцца поры года і перыяды асноўных сельскагаспадарчых работ: саха – вясна, аранне; каса – лета, нарыхтоўка сена; серп – мяжа лета і восені, збор ураджаю; падкова – мяжа восені і зімы, зімовае падкоўванне коней; цэп – зіма, малацьба. Мы бачым сімвалічнае адлюстраванне ўсяго земляробчага цыкла. Таксама можна дапусціць і пэўнае магічнае значэнне дадзеных знакаў. Варта звярнуць увагу на апісаны А. Сержпутоўскім звычай у рэгіёне, адкуль паходзіць каляндарны кій. На свята Хрэсцы (сярэдзіна (серада на чацвёртым тыдні) Вялікага посту) на хлебе выпякалі крыжык, саху, барану, серп і іншыя гаспадарчыя рэчы [15, с. 192]. Дадзены звычай можна разглядаць у кантэксце рытуальнага праграмавання сельскагаспадарчага года: стварэнне выяў прылад працы сімвалічна ўзнаўляе адпаведныя перыяды работ, што накіравана на іх паспяховую рэалізацыю.

У цэлым суаднясенне каляндарных перыядаў з пэўнымі відамі работ было пашыранай з’явай у еўрапейскіх краінах аж да позняга Сярэдневякоўя і Новага часу. Беларускія землі не з’яўляюцца выключэннем. У якасці прыкладу можна ўспомніць верш Сімяона Полацкага «Miesięci 12 następują» («Наступаюць 12 месяцаў»), дзе апісваецца паслядоўная змена месяцаў і знакаў задыяка, якія ім адпавядаюць. Кожны месяц, у сваю чаргу, характарызуецца вызначаным для гэтага часу відам заняткаў. Прасочваецца магчымасць уплыву знакаў задыяка на зямныя падзеі [20, с. 127–128]. Каляндарны цыкл гравюр А. Тарасевіча з кнігі «Rosarium et Officium Beatae Mariae Virginis…» (1672) таксама дэманструе сімвалічную сувязь месяцаў, знакаў задыяка і пэўных відаў работ. Акрамя таго, сярод беларускіх валачобных песень ёсць асобная група песень, якія адлюстроўваюць народны каляндар. У іх апісваецца паслядоўнасць свят і іх святых апекуноў, якія выконваюць тую ці іншую сельскагаспадарчую работу, у тым ліку аранне, касьбу, жніво, малацьбу [21, с. 108–184]. Такім чынам, разьбяны драўляны каляндар са Слуцкага павета знаходзіцца ў рэчышчы гэтай даўняй традыцыі.

Разгледжаныя выявы на календары цалкам адпавядаюць мясцовым рэаліям, пры гэтым варта адзначыць пэўныя паралелі са знакамі на скандынаўскіх рунічных календарах, на якіх адлюстраваны тыя ж самыя сельскагаспадарчыя прылады ў тыя ж перыяды года. З аднаго боку, дадзенае падабенства можна патлумачыць блізкімі ўмовамі для вядзення гаспадаркі, а з іншага – нельга выключаць пэўнага запазычвання, але не наўпрост з разьбяных рунічных календароў XVI–XVII стст., а са шведскіх каляндарных табакерак XIX ст., якія сяляне, цалкам верагодна, маглі бачыць. У прыватнасці, на такую імавернасць паказвае выява падковы. Яна рэдка сустракаецца на іншых драўляных календарах, вядомых у праваслаўных рэгіёнах[4], але затое прысутнічае сярод знакаў на скандынаўскіх рунічных календарах і табакерках: перавернутая падкова пазначае 19 лістапада, што звязваецца з вобразам святога Марціна, які ў іканаграфіі часта малюецца вершнікам, а таксама з патрэбай падкоўваць коней перад марозным і слізкім надвор’ем [19, p. 326]. Калі дапускаць імавернасць запазычвання, то відавочна, што беларускі селянін, разьбяр календара, выбраў толькі тыя знакі, якія адпавядаюць мясцовым рэаліям.

Разглядаючы каляндар са Слуцкага павета, нельга абысці ўвагай і магчымыя культурныя паралелі і перадумовы для фарміравання і распаўсюджвання такога тыпу артэфактаў для ўліку часу на тэрыторыі Беларусі. Як адзначала ў 1938 г. К. Крываруказа з с. Ям Пскоўскай вобласці, час раней «считали по неделям» і «на стяны “*зарубочкам и крючочкам отмячали*”»[5] (тут і далей курсіў наш. – *І. Б.*, *Д. С.*). Тут ужо згадваліся сведчанні пра тое, што на тэрыторыі Беларусі таксама практыкаваліся падобныя спосабы складання календароў. Апрача гэтага, М. Анімеле ў працы «Быт белорусских крестьян» пісаў: «Замечают, что в этот день [1 января] – “дзень ужó пабóльшіў на гусіную лапку”. Причина сравнения прибыли дня вот какая: любознательные хозяева *засекают на стене* края последнего луча заходящего солнца и первого восходящего; солнце, поднимаясь выше на небосклоне, восходя и заходя позднее или ранее против того дня, когда *сделаны были заметки*, подвигает взад или вперед и края лучей своих, падающих на стену; а как *заметки делаются в самый кратчайший день*, т. е. 10 декабря, то к 1 января день, без сомнения, уже значительно увеличится, солнце зайдет не на том уже месте, где заходило прежде, и луч его, падавший краем на заметку, подвинется далее; небольшое пространство этого передвижения лучей, будучи длиною приблизительно в гусиную лапку, и подало повод к упомянутому сравнению» [22, с. 228]. Як бачна, падобны спосаб лічэння і нанясення каляндарных адзнак быў пашыраны сярод беларускіх сялян.

Засечкі на календары са Слуцкага павета, якія пазначаюць колькасць дзён, аналагічны засечкам на касцяных падліковых бірках, знойдзеных пры раскопках у Брэсце (датуюцца канцом XII – пачаткам XIV ст.). Дзве такія біркі знаходзяцца ў экспазіцыі археалагічнага музея «Бярэсце». На грані рабра

[4]У літаратуры намі выяўлена адна згадка пра тое, што піктаграма ў выглядзе падковы і малатка выкарыстоўвалася для пазначэння свята Пакровы (1 кастрычніка) і азначала перакоўку коней на зімовыя падковы [6, с. 111].
[5]Eesti Kirjandusmuus. Eesti Rahvaluule Arh. (ERA). Vene 12, 304 (12). (Цытата прыводзіцца з захаваннем моўных асаблівасцей арыгінала.)

жывёлы нанесены трохкутныя засечкі. На адной з бірак пазнакі прысутнічаюць толькі з аднаго боку, а на другой – з абодвух бакоў [23, с. 284–285]. Агульны выгляд засечак сведчыць пра выкарыстанне самага простага і зручнага спосабу нанясення пазнак і дадаткова гаворыць на карысць мясцовага паходжання вывучаемага календара, хоць увогуле падобныя біркі вядомы ў перыяды Сярэдневякоўя і Новага часу як на тэрыторыі Заходняй Еўропы, так і ў Старажытнай Русі. Вывучаючы апошнія, П. Каласніцын адзначае, што «зафиксировано также относительно большое количество бирок, содержащих числа 29 и 30. При этом 28 и 29 встречаются чаще, чем 30. <…> Возможно, ответ кроется в том, что 28 и 29 – это число дней в месяце (лунном или календарном). Вероятно, бирки, содержащие числа, кратные семи, а также 29 и 30, использовались для календарных подсчетов…» [24, с. 272]. Дадзенае назіранне важна для вывучэння пытання паходжання разьбяных календароў і вылучэння іх рэгіянальных тыпаў.

В. Сразнеўскі выдзяляў два віды разьбяных драўляных календароў:

- паўночна-заходні (скандынаўскі);
- паўночна-ўсходні, які існаваў у розных народаў, што насялялі паўночныя рэгіёны Расійскай імперыі.

Агульнымі рысамі двух вылучаных відаў календароў аўтар называе форму (палка, брусок) і размяшчэнне ў гарызантальным радку двух шэрагаў знакаў – штодзённых і святочных. Скандынаўскія календары з’яўляюцца больш дасканалымі, адпавядаюць патрабаванням розных каляндарных разлікаў, засноўваюцца на месячным календары. У скандынаўскіх календарах няма падзелу месяцаў, у той час як у так званых усходніх календарах месяцы вылучаюцца заўсёды. Засечкі для лічэння дзён сустракаюцца на драўляных календарах усіх рэгіёнаў, аднак на скандынаўскіх выкарыстоўваюцца рэдка і пераважна на пазнейшых узорах, тым часам як на ўсходніх сустракаюцца заўсёды. Пры гэтым форма паўночна-ўсходніх календароў таксама адрозніваецца ў залежнасці ад рэгіёна і насельніцтва: чатырохвугольная палка характэрна для ўсходнеславянскага насельніцтва, шасцігранны брусок – для комі і іншых неславянскіх народаў [14, с. 68, 73], хаця варта адзначыць, што такая форма календароў сустракаецца і сярод славянскага насельніцтва.

Да гэтага таксама трэба дадаць яшчэ некалькі характэрных рыс. Адлік года ва ўсходніх календарах часта ідзе з 1 сакавіка, а ў скандынаўскіх – з 1 студзеня. Скандынаўскі каляндар сустракаецца ў каталіцкіх і пратэстанцкіх рэгіёнах, а паўночна-ўсходні – у праваслаўных. Хоць у календарах абодвух тыпаў В. Сразнеўскі вылучаў у якасці агульнай прыкметы два шэрагі знакаў для дзён і свят, для скандынаўскіх календароў часцяком характэрна наяўнасць трох шэрагаў знакаў – дні тыдня, святы, фазы Месяца.

## Заключэнне

Разглядаючы разьбяны драўляны каляндар з в. Чудзін Слуцкага павета ў кантэксце адзначаных каляндарных традыцый, можна зрабіць наступныя высновы.

1. Тыпалагічна гэты каляндар можа быць аднесены да так званых паўночна-ўсходніх ці ўсходніх разьбяных драўляных календароў (паводле вызначэння В. Сразнеўскага). На карысць гэтага сведчаць форма палкі-кія, адлік новага года з 1 сакавіка, выкарыстанне насечак для пазначэння дзён, дзяленне на месяцы, размяшчэнне знакаў у два шэрагі, адсутнасць прыкмет месячнага календара (няма знакаў для пазначэння фаз Месяца).

2. Адкрытым застаецца пытанне ўплыву скандынаўскіх разьбяных календароў, у тым ліку праз знаёмства сялян са шведскімі каляндарнымі табакеркамі XIX ст., што выяўляецца ў прысутнасці на календары са Слуцкага павета знакаў для пазначэння перыядаў асноўных сельскагаспадарчых работ, характэрных для скандынаўскіх календароў.

3. На календары са Слуцкага павета адзначаны тыя святы праваслаўнага царкоўнага календара, якія былі важнымі ў народным календары дадзенай мясцовасці, скарыстаны тыповыя для рэгіёна знакі для пазначэння работ. У цэлым можна заключыць, што разгледжаны каляндар у строгім сэнсе не з’яўляецца царкоўным календаром, а адлюстроўвае найбольш значныя рэлігійныя святы, звязаныя з гадавым сельскагаспадарчым цыклам.

4. Можна выказаць здагадку, што ў аснове календара ляжыць архаічны спосаб лічэння часу, адлюстраваны ў сярэдневяковых падліковых і каляндарных бірках, а таксама ў пазнейшых этнаграфічных сведчаннях. Нягледзячы на пэўнае тыпалагічнае падабенства з іншымі артэфактамі такога тыпу, на календары са Слуцкага павета прысутнічае арыгінальная сістэма знакаў для пазначэння святочных дзён, якая, магчыма, узнікла ў папярэдніх стагоддзях і захавалася да пачатку XX ст.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Cucina C. Runes in peripheral Swedish areas. The early ethnographic literature on calendar staves in the Baltic Islands. In: Setaioli A, editore. *Apis Matina. Studi in onore di Carlo Santini*. Trieste: Edizioni Università di Trieste; 2016. p. 188–203.
2. Климка ЛА. Рунические календари в Литве. В: Гурштейн АА, редактор. *Историко-астрономические исследования. Выпуск 18*. Москва: Наука; 1986. с. 339–344.

3. Баранова ОГ. Русские деревянные календари в собрании РЭМ. *Живая старина*. 1998;3:25–28.

